– Уладзімір Калеснік і Янка Брыль не толькі штогод наведвалі Валеўку, але і прывозілі сюды сваіх сяброў, знаёмых літаратараў, аднадумцаў. Сярод іх былі – украінскі пісьменнік Максім Рыльскі, балгарскі пісьменнік Георгій Вылчаў, беларускія літаратары Ян Скрыган, Фёдар Янкоўскі, Алесь Адамовіч, Уладзімір Караткевіч і дзесяткі іншых знакамітых людзей. Уладзімір Калеснік любіў знаёміць з Наваградкам і ваколіцамі студэнтаў філфака Брэсцкага педінстытута ў якім ён працаваў. Усім бацька ўдзяляў увагу, не шкадаваў часу на



Валерый Петрыкевіч (трэці злева) з краязнаўцамі і гісторыкамі

правядзенне экскурсій не толькі ў школьным музеі, але і ў наваколлі, на Свяцязі, Наваградку, Завоссі, Чамброве, Радагошчы і г.д.

Максім Рыльскі, які ў 1955 годзе збіраў матэрыял для артыкула, прысвечанага 100-годдзю з дня смерці Адама Міцкевіча, быў вельмі ўдзячны бацьку за экскурсіі па Міцкевічавых мясцінах, і называў яго ласкава „наш Чычэроне".

З канца 1950-х гадоў ляснічоўку на беразе Свіцязі Янка Брыль, а потым і Фёдар Янкоўскі, выбіралі для сямейнага адпачынку. Неаднаразова гэтыя знакамітыя, але сціплыя, не ганаровыя людзі, гасцявалі ў нашай невялікай хаце, летам, як правіла, на гарышчы, на пахучым сене спалі. Бывалі і застоллі на Свяцязі, ці на беразе чыстай крынічнай рачулкі, што апаясвала наш агарод, з вогнішчамі, з юшкай альбо з печанай у прыску бульбай і гарбаткай, настоенай з таго, што расло побач – чабор, мята, маліна, чорныя парэчкі, суніцы ці проста сунічнік альбо брусьнічнік.

Сярод дарослых і Вы магчыма бывалі, слухалі іх, запаміналі. Так?

– Мне, як старэйшаму і меўшаму з пятага класа вопыт удзелу ў турыстычных паходах і злётах школьнікаў абласнога і рэспубліканскага маштабаў, бацькам давяралася сачыць за вогнішчам, забяспечваць крынічнай вадой, што-небудзь своечасова паднесці з агароду ці з хаты. Карацей – быць „на падхваце". І я з гонарам выконваў свой абавязак. Калі такое „мерапрыемства" арганізоўвалася на Свіцязі, то я, ужо без „запрашэння", самавольна альбо па даручэнні матулі, нібы незнарок, трапляў на ровары ў тое месца, дзе госці купаліся, падсілкоўваліся, вялі гутарку за „чаркай". Размовы былі доўгімі, стол бядней і бацька прасіў мяне ласкава аб „рэйсе" у Валеўку, каб маці наклала таго-сяго з агароду і кладоўкі. Звычайна гэта былі агуркі, цыбуля, радыска, кроп, сала ці кавалачак кумпяка, хлеб. І я з вялікім задавальненнем выконваў гэтую „місію". Будучы школьнікам сярэдніх класаў мяне не цікавала пра што вялася размова ў бацькавай кампаніі з гасцямі, а пазней я стаў прыслухоўвацца, асабліва ў такія моманты, калі гутарыць пачыналі даволі ціха.

І аб чым яны гутарылі тады?

– Застаўся ў памяці прыезд у Валеўку надвячоркам аднаго з апошніх чэрвенскіх дзён 1963 года Уладзіміра Калесніка і Янкі Брыля і трэцяга з імі. Ён быў значна маладзейшы за ўсіх, круглатвары, у караткаватых на мой погляд, шырокіх і, трохі памятых за дарогу, портках. На першы погляд дабрадушнага „прастака". Калі Янка Брыль знаёміў яго з бацькам і назваў Караткевічам, то мне, чамусьці, падумалася, што гэта яго псеўданім, бо ён носіць кароткія порткі. Не ведаў я тады, што гэта адзін з найталенавіцейшых беларускіх пісьменнікаў, які хутка заваюе вялікую папулярнасць і любоў чытачоў, шмат зробіць для вяртання гістарычнай памяці свайму народу.

Прыезжыя былі адчувальна здарожаныя і вельмі ўсхваляваныя. На беразе нашай рачулкі сілкаваліся на разасланай дзяружцы. На гэты раз без вогнішча. Вялі размову-спрэчку пра Ларысу і Янку з Зэльвы, скуль яны і прыехалі. Ларыса ўсімі суразмоўцамі характарызавалася вельмі станоўча. А вось пра свайго цёзку Янку, Брыль адклікаўся адмоўна і зусім не хацеў яго ўспамінаць. Калеснік, як мне падалося, трымаў „нейтралітэт". Караткевіч стараўся апраўдаць зэльвенца, матывуючы яго паводзіны пры іх сустрэчы, цяжкім мінулым.

Пазней бацька мне распавёў пра Ларысу Геніюш і яе мужа Янку, пра іх лёс і пра тое, як яны апынуліся ў Зэльве, а вось пра сэнс той спрэчкі – ані слова, маўляў, табе гэта не патрэбна. Я і сёння не ведаю. Толькі здагадваюся. Але дагадкі – ёсць дагадкі. Якраз, напярэдадні гэтых падзей, я прачытаў у нейкім, не памятаю ўжо, расійскім часопісе, перададзеным бацьку стрыечным братам з Наваградка, Раманам Лецкам, аповесць Салжаніцына „Адзін дзень Івана Дзянісавіча". І мне, чамусьці завочна, спадабаліся зэльвенскія Ларыса і Янка, якія, як і Раман Лецка, і сотні тысяч іншых беларусаў, зведалі ўсе пакуты сталінскіх лагераў.

А ці гасцяваў у Вас яшчэ Уладзімір Караткевіч?

– У 1964 годзе Янка Брыль, Уладзімір Калеснік і Уладзімір Караткевіч зноў завіталі ў нашу вёску Валеўка, здаецца, у ліпені. Бацька быў у суседніх Мірацічах, дзе загадваў летнікам для дзяцей Карэліцкага раёна. Маці таксама адсутнічала. Госці, чакаючы бацькоў, на вуліцы каля хаты доўга размаўлялі з намі, дзецьмі. Пазней Уладзімір Калеснік гэты дыялог са мной апісаў у нарысе „Партрэт друга". Уладзіміра Караткевіча вельмі цікавіла Валеўская 300-гадовая драўляная царква. Я адразу пра яе выклаў яму ўсе свае веды. Пра святара Міхаіла Лінніка, пра яго дзяцей – нашых аднагодкаў, пра святкаванне Вялікадня з усяночнай, пра традыцыю апоўдні назаўтра збірацца амаль усёй дзятве, ды і вясковым дзецюкам на „бойку" яйкамі, пра фэст на Пятра і Паўла, пра тое, што раней гэта быў касцёл, у якім шмат разоў бываў Адам Міцкевіч. Настрой Уладзіміра Сямёнавіча быў выдатны. Яму, напэўна, спадабаўся і мой аповед. Развітваючыся, ён паабяцаў яшчэ раз наведаць Валеўку. Гэта сталася, калі мы ўжо перабраліся ў Дзятлава. Знаёмыя валеўчане казалі, што амаль цэлы дзень пісьменнік правёў у царкве, разглядаў іконы, чытаў царкоўныя кнігі і запісы. Не магу сцвярджаць, але хутчэй за ўсё гэта ён вызначыў, што некалькі абразоў былі напісаны Васняцовым ці мастакамі яго школы. У канцы XX стагоддзя нейкія злыдні-рабаўнікі з Мінска выкралі іх.

У гэты ж дзень, пазней, мне давялося яшчэ раз спаткацца з

гэтымі волатамі беларускай літаратуры. Адвячоркам на ровары я паехаў па завядзёнцы пакупацца на Свіцязь. Шаноўная „кампанія" знайшла майго бацьку і, зрабіўшы падарожжа ў Плужыны, Варончу, Туганавічы і Карчова, ды ўдоваль наблукаўшы па сцежках Адама Міцкевіча і Яна Чачота, з асалодай выкупаўшыся ў асвяжаюча-гаючай вадзе Свіцязі, вячэрала пры невялікім вогнішчы. Уладзімір Караткевіч нават прапанаваў мне ці то ўсур'ёз, ці дзеля „этыкету" чарку. Сам быў ужо „весялейшы" за ўсіх. Вядома ж, я адмовіўся, бо не ўжываў спіртнога і нават не марыў аб гэтым. Вельмі хацелася стаць „вялікім" спартсменам. А вось кавалак сала з'еў, ды з асалодай асушыўшы шклянку ліманаду, паехаў дахаты. Бо вечарам было прызначана спатканне з дзяўчынай. На развітанне Уладзімір Караткевіч, моцна цiснучы маю руку, назваў мяне яцвяжскалітвінскім гракам і пажадаў высокага палёту.

А чаму гракам, ды яшчэ яцвяжска-літвінскім?

– Напэўна таму, што я быў чарнявы і з карымі вачыма. А вось пра яцвяжска-літвінскага хацеў спытаць у яго – ды не хапіла смеласці. А сёння – няма магчымасці.

А ці чыталі Вы што з твораў Уладзіміра Караткевіча да сустрэчы з ім?

– На вялікі жаль да сустрэчы з гэтым самабытным чалавекам, з таленавітым пісьменнікам, я нічога не чытаў з яго твораў. Гэта значна пазней яго творы „Дзікае паляванне караля Стаха", „Хрыстос прызямліўся ў Гародні", „Зямля пад белымі крыламі" былі з цікавасцю прачытаныя мною. А апошні твор увогуле стаў настольнай кнігай. З такім замілаваннем Уладзімір Караткевіч апісвае ў ёй родныя мае мясціны – Валеўку, Варончу, Свіцязь, Наваградчыну ў цэлым, ды і іншыя запаветныя куточкі нашай Беларусі, традыцыі народа, любімыя стравы, абрады, што кожны раз, калі я адкрываю яе, у памяці паўстае вобраз вялікага мастака слова, вясёлага і шчырага чалавека.

Не мінаў Вашу сям'ю ніколі і Янка Брыль.

– З Іванам Антонавічам Брылём я бачыўся дзесяткі разоў. Нагадаю пра дзве сустрэчы, якія запомніліся. Гэта было восенню 1996 года. Я – дэлегат Першага Усебеларускага кангрэса дэмакратычных сіл. Дэлегацыя дзятлаўчан прыехала за пару гадзін да пачатку форума. Зарэгістраваўшыся, вырашыў прайсціся па праспекце Францыска Скарыны. На выхадзе, на прыступнах палаца прафсаюзаў, бачу высокага, статнага, у традыцыйным чорным бярэце, вельмі знаёмага чалавека. Так і ёсць – Янка Брыль. Радасна павітаўшыся даведаўся, што Іван Антонавіч пачэсны госць гэтага ж мерапрыемства. Яго вельмі цікавіла, як жыве мой бацька ў Вільні (яны ліставаліся, але хіба ўсяго ў пісьме не скажаш). Паважаны пісьменнік паскардзіўся на сваё здароўе і сказаў, што цяжка стаяць, лепш хадзіць. І мы павольна пашпацыравалі ў бок ГУМа. Я распавёў, чым займаецца бацька, з кім там пасябраваў, як часта бывае ў Таварыстве беларускай культуры, з якім задавальненнем ён слухае па радыё дзесяціхвілінную беларускамоўную праграму Ёнаса Лаўрынавічуса, што дапамагае Аляксею Анішчыку ў напісанні ўспамінаў пра Навагрaдскую беларускую гімназію, пра прыезд у Вільню Барыса Кіта і г.д. Івана Антонавіча цікавіла і тое, як жывуць мае дзеці – унукі майго бацькі, асабліва старэйшая Таццяна, у якой Брылёва дачка, Галіна Іванаўна, выкладала іспанскую мову ў Мінскім інстытуце замежных моў і вельмі хваліла за здольнасць і стараннасць, падкрэсліваючы, што ў яе напэўна дзедавы гены.

Было перагаворана і аб сённяшнім жыцці Дзятлава, справах у музеі, настроі людзей і г.д. Гадзіна часу праляцела непрыкметна. Калі мы вярнуліся у палац прафсаюзаў, то Брыля сустрэў адзін з арганізатараў Кангрэсу Юрый Захаранка. Іван Антонавіч пазнаёміў яго і са мной. Развітаўшыся, Янка Брыль заняў месца ў першым радзе партэра, а мы – на балконе. Кангрэс, яго дух, патрыятычны настрой удзельнікаў і выступоўцаў, давалі тады надзею на лепшае. І я ў гэта верыў. На вялікі жаль, я памыляўся.

Здаецца Вы былі сябрам рады БСДГ?

– Будучы нязменным сябрам Цэнтральнай рады БСДГ, яшчэ з тых часоў, калі партыяй кіраваў Алег Трусаў, мне даводзілася па некалькі разоў на год бываць на іх пасяджэннях. З пачатку 2000-х гадоў яны праводзіліся ў офісе партыі на праспекце Машэрава, 78. У гэтым доме тады жыў і Янка Брыль. Таму заўсёды стараўся, хоць на некалькі хвілін, завітаць да аднаго з лепшых сяброў майго бацькі. Брыль з радасцю мяне сустракаў і заўсёды шкадаваў, што ў мяне мала часу, што няма магчымасці пасядзець, выпіць кубачак гарбаткі. У апошні такі візіт, калі не памыляюся напачатку 2005 года, Іван Антонавіч выказаў мне свой боль, што яму не дазволілі пахаваць жонку на Усходніх могілках Мінска. А ў Калодзішчах, да месца спачыну сваёй „палавіны" вельмі нязручна і доўга дабірацца. Гэта была мая апошняя сустрэча з народным пісьменнікам Беларусі – вялікім Янкам Брылём.

Пасля смерці бацькі, я з Янкам Брылём ліставаўся. За пару месяцаў да сваёй смерці, Іван Антонавіч, будучы ўжо сам цяжка хворы, даведаўся ад маёй сястры Святланы, пра пастаўлены мне дактарамі дыягназ невылечнай хваробы, ён даслаў кароценькі ліст. У ім жадаў мне, каб я трымаўся і спадзяваўся на лепшы зыход. Сёння я шчыра дзякую Богу, з чые ласкі і з прарочых слоў незабыўнага Івана Антонавіча, я жыву і нешта намагаюся зрабіць на карысць Бацькаўшчыны. Шкадую толькі, што не змог правесці яго ў апошні шлях.

Шчыра сябраваў Ваш бацька і Вы з літаратуразнаўцам, прафесарам Брэсцкага педінстытута Уладзімірам Калеснікам. Так?

– Сустракацца з Уладзімірам Калеснікам лёсам мне было наканавана не менш чым з Янкам Брылём. У 1975 годзе я з вучнямі Дзятлаўскай першай школы арганізаваў шматдзённы сплаў на вёсельных лодках па бацьку-Нёману ад Стаўбцоў да Беліцы. У адзін дзень заўважылі з правага берагу цудоўнае месца для начлегу. Сярод лесу была шырокая прагаліна з хаткаю і студняй, са сцежкай да самай ракі, а на ўзбярэжным грудочку ўбачылі шалаш. Сцены яго былі аплецены лазой, саламяны дах, уваход завешаны дзяружкай. Не паспелі туды прычаліць, як некалькі вучняў наперабой пачалі выказваць свае прапановы наконт начлегу ў гэтым шалашы. І раптам, о дзіва, на дзіцячы гоман выходзіць з яго інтэлігентны, статны, прыгожы жыхар гэтага шалашу. І я адразу пазнаю Уладзіміра Калесніка, які шчыра са мной вітаецца за руку, радуецца неспадзяванай сустрэчы, распытвае ў школьнікаў аб уражаннях ад падарожжа і далікатна выказвае спадзяванне, што падчас адпачынку мы не вельмі шумна будзем сябе паводзіць, бо яму пільна трэба закончыць пісаць нейкі артыкул.

На другі дзень раніцай Уладзімір Андрэевіч падыйшоў да нас і пачаў з намі гутарку, а таксама адказваў на пытанні школьнікаў. Мы потым, перад спускам лодак на ваду, заглянулі да яго ў шалаш. І былі вельмі здзіўленыя спартанскаму ладу адпачынку і пісьменніцкай працы знакамітага навукоўца. А яму для плёну, аказваецца, найлепш падыходзілі не гарадскі камфорт, а свежае паветра, лёгкі шумок сасновага бору, лагодны шчэбет птушак, усплёск нёманскай хвалі і часовая адзінота. Ложак з сяннікам і кажухом, самаробны драўляны стол з табурэткай, ды і сам „дом” з лазовымі сценамі, упрыгожанымі па-мастацку апрацаванымі карчамі, карэннямі, пакручастымі галінамі дрэў – усё гэта было зроблена ім самім непадалёку ад яго роднай вёскі Сіняўская Слабада на беразе Нёмана.

Апошняя мая сустрэча з Уладзімірам Калеснікам адбылася ў 1989 годзе ў Брэсце на яго кватэры. Я з жонкай і з дзецьмі па запрашэнню геолага з Германіі, на ўласным аўтамабілі выбраліся ў горад Фрайберг. Шлях ляжаў праз Брэст, дзе планавалася пераначаваць, каб зранку зноў рушыць у дарогу. Мы завіталі да Калеснікаў. Гаспадар нас шчыра прыняў. У кватэры мы ўбачылі шмат ягоных мастацкіх твораў – апрацовак лясных карэнняў, а таксама разьбу па дрэве, карцін, напісаных алеем, у асноўным гэта былі пейзажы і замалёўкі роднай прыроды, фотаздымкаў, бо ён прафесійна займаўся фатаграфіяй і кніг. Як у яго на ўсё гэта хапала часу, калі ўлічыць, што выкладчыцкая праца ва ўніверсітэце займала большую частку працоўнага дня. Аказваецца, у кожных сутках для творчых людзей ёсць яшчэ і ноч.

У той вечар мы тоўга гутарылі пра майго бацьку, пра маё захапленне водным турызмам, пра перабудову Міхаіла Гарбачова, пра нашу родную мову і г.д. Апоўначы Уладзімір Андрэевіч пажадаў нам шчаслівай паездкі і парэкамендаваў больш падарожнічаць па роднай Беларусі, бо ў нас яшчэ столькі нязведанага, цікавага, але ўсё гэта трэба навучыцца шукаць, а знайшоўшы – фатаграфаваць, расказваць, апісваць, распавядаць іншым.

Спадар Валерый, Вы яшчэ добра ведалі беларускага мовазнаўцу, пісьменніка, заслужанага дзеяча навукі Беларусі Фёдара Янкоўскага, які сябраваў з вашым бацькам.

– З Фёдарам Міхайлавічам Янкоўскім сустрэч было няшмат. Валеўскія дзеці, як і ўсе іншыя, любілі лавіць рыбу. Калі я вучыўся ў пачатковых класах, мы лавілі рыбу рукамі пад каменнямі ў нашым ручайку ў вёсцы Валеўка на Наваградчыне. Траплялiся аркушкі, сліжы, зрэдку кялба, бо іншай рыбы ў водах безымяннага прытоку Нёўды і не было. А вось ніжэй Валеўскага млына, ужо ў самой Нёўдзе, вадзіліся акуні і плоткі, тыя ж сліжы і кялба, былі шчупакі і стронга. Узброіўшыся вялікім кашом ці таптушкамі (сетка большая за кош) мы прафільтроўвалі ўсе рачныя ямкі ад Валеўкі да суседняга Мондзіна – роднай вёскі пісьменніка, педагога, грамадскага актывіста Аляксея Анішчыка (1912-2007). Пазней Мондзіна перайменавалі ў Чаромушкі. Некалькі дзесяткаў дробнай рыбы заўсёды ўдавалася злавіць. Аднойчы, толькі распачалі рыбацкі працэс, як на паверхню вады сталі ўсплываць жыватамі напаўжывыя стронгі, ды не маленькія, а як добры селядзец, грамаў па 300-400. Подбегам беглі па цячэнню і рукамі лавілі іх. Хутка наш коўш напоўніўся так, што яго не змаглі несці. Прыхавалі ў крапіве пад кустом. Пасля напхалі ў кашулі, майкі, завязаўшы рукавы на вузлы. Перад самым Мондзілам рыбы сталі больш рухавымі, у рукі не даваліся, ды і падзець іх не было куды. Каб даставіць здабычу дахаты, спатрэбілася два рэйсы. Спачатку ў кашулях і майках, а потым – вярнуцца з роварам па прыхаваныя кашы. Улова хапіла сабе, суседзям і знаёмым на некалькі дзён. Бацька, калі ўбачыў, што мы налавілі, спачатку хацеў нас „пачаставаць” лазінай, але, даведаўшыся як, на другі дзень сам пабег налавіць рыбы ў Нёўдзе. Высветлілася, што адзін калгасны трактарыст „старанна” вымыў трохкубовую бочку, у якой вазіў нейкае вадкае ўгнаенне, бо яму тэрмінова трэба было ехаць на спіртзавод па пераганую брагу на корм жывёле. Зрабіў ён гэтую справу з усёй „акуратнасцю”, заехаўшы проста ў рэчку. Праз дзень ці два пасля гэтай падзеі, прыехаў адпачыць на Свіцязі Фёдар Янкоўскі з сям'ёй. Фёдар Мі-

хайлавіч быў вялікім аматарам рыбалкі. Даведаўшыся пра такі ўлоў, ды пра такую рыбу, адразу прыехаў паглядзець на Нёўду. Я павёў яго на месца „злачынства”. Ён толькі охаў ды ахаў, любуючыся маляўнічай рачулкай. Праз дзень Фёдар Міхайлавіч вярнуўся на Нёўду з дзесяткам донных вудачак, каб праверыць, ці не ўся рыба атручана. На гэты раз пайшлі ажно да Мондзіна. Спачатку ён, як „шпіён”, непрыкметна падыходзіў да зарослых кустоўем берагоў, нешта цікаваў, а пасля выстаўляў вуды. Ад Валеўкі мы тады адыйшлі ажно кіламетраў 5-6. Staміліся, паляжалі на траве, узышлі на старажытнае гарадзішча, з якога адкрываўся цудоўны, непаўторны від на наваколле. А тым часам, сонца ўжо кранался зубцоў далёкага лесу. Подбегам здымалі донкі. Апошнюю вуду ледзьве знайшлі ў пацёмках. Але затое, амаль на ўсіх была здабыча – стронгі сярэдніх памераў па 300-400 грамаў. Адна прыгажуня здзівіла і мяне, акурат яна трапіла на тую апошнюю вуду. Даўжыня яе была з паўметра і вага паўтары кілаграмы не менш. Але, найбольш здзівіў мяне сам рыбак. Акуратна зняўшы здабычу з кручкоў, палюбаваўшыся ёю, выпускаў назад у крынічную ваду Нёўды. У рыбацкую торбу паклаў толькі дзве рыбіны, якія былі моцна паранены. Пры гэтым казаў: „Трэба ж і жонку Серафіму парадаваць”.

У Валеўку вярнуліся апоўначы. Па дарозе Фёдар Міхайлавіч выказваў радасць, што стронга яшчэ будзе вясціся ў Нёўдзе. Меркаваў, што гэта рэчка была паўнаводнай і, напэўна, старажытныя насельнікі гарадзішча здабывалі ў ёй і ласосяў, і харыусаў, і стронгу. „А сёння, казаў Фёдар Янкоўскі, – трэба біць ва ўсе званы, каб калгасная хімія больш не трапляла ў рэкі і рачулкі. Рыбакам, калі патрапіць на вуду рэдкі „экземпляр”, неабходна яго адпусціць у ваду, каб было патомства. Рыбалка для чалавека павінна быць не самамэтай, а больш для адпачынку”. Вось такім рыбаком і дабрадушным, высокаадукаваным чалавекам запомніўся мне прафесар Фёдар Янкоўскі – аўтар шматлікіх кніг па мовазнаўству, зборнікаў крылатых слоў і афарызмаў, слоўнікаў і кніг мастацкай прозы.

Спадар Валерый, ведаю, што Вы некалі актыўна займаліся спортам, з’яўляецеся кандыдатам у майстры спорту па водным турызме і здзейснілі сотню турыстычных паходаў…

– Спачатку была лёгкая атлетыка, футбол і хакей з шайбай, а турызм значна пазней. Здаецца ў 1960 годзе я падпісаўся на часопіс „Лёгкая атлетыка” і вельмі хутка палюбіў гэты від спорту. Самастойна, упарта займаўся ім. Паколькі адметных фізічных дадзеных ад прыроды я не меў, то спрабаваў усё. Кідаў самаробныя драўляны дзіды, штурхаў каменні, бегаў, скакаў у даўжыню і вышыню, нават і з шастом (звычайнай арэшынай). У дадатак быў і футбол, і валейбол, і „два агні” (выбівалы), а летам – амаль штодзённае плаванне на Свіцязі, зімой – актыўна ездзіў на лыжах. У класе па многіх відах быў першым, а на школьных спаборніцтвах – толькі прызёрам, займаў заўсёды другія ці трэція месцы.

З 1962 года нашу вёску Валеўку далучылі на Навагрудскага раёна. У горадзе працавала секцыя лёгкай атлетыкі ў мясцовай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе (ДЗЮСШ) і таму праграма раённых школьных спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы была больш змястоўнай, чым у колішнім Карэліцкім раёне. Акрамя традыцыйнага бегу і скачкоў, былі і кіданні дыска, штурханне ядра, бар’ерны бег, скачкі з шастом, лёгкаатлетычнае шматбор’е. А паколькі ні ў адным з відаў я не быў першым у школе, настаўнік фізкультуры „вызначыў” быць мне шматборцам. Вынік быў нечаканы: стаў чэмпіёнам. Выканаў трэці дарослы спартыўны разрад недацягнуўшы да другога з дзесяці ачкоў.

Асаблівы поспех чакаў мяне ў сектары для скачкоў у вышыню з шастом. Гэты від вельмі вабіць гледачоў. Мой выхад у сектар з шастом з арэшыны расмяшыў заўзятараў, якія шчыльна абступілі месца спаборніцтваў. Пасля, калі ў сектары застаўся толькі вучань Навагрудскай ДЗЮСШ ды я, кожная ўдалая спроба сустракалася бурнымі воплескамі. Мой вынік – тры метры роўна, а ў наваградчыніна на 10 см менш. Так пачалася „кар’ера” лёгкаатлета-дзесяціборца. Праз два гады стаў першаразраднікам, а вось да кандыдата ў майстры спорту кожны раз не хапала то 5, то 10 ачкоў. А на рэспубліканскіх спаборніцтвах сельскіх спартсменаў таварыства „Ураджай” у горадзе Слуцку не хапіла 2 ачкі. Гэта быў мой лепшы вынік за ўвесь час майго ўдзелу ў спаборніцтвах.

Акрамя самых спартовых паядынкаў, вабілі паездкі ў розныя гарады Беларусі і за яе межы. Каля дзесяці гадоў быў чальцом зборнай каманды Беларускага савета ДСТ „Ураджай”, пабываў у Прыбалтыцы, на Паўночным Каўказе, Сярэдняй Азіі, на Крымскім паўвостраве і на Чарнаморскім узбярэжжы. Запомніліся некалі Усесаюзныя спаборніцтвы лёгкаатлетаў-дзесяціборцаў, арганізаваныя Цэнтральным саветам прафсаюзаў СССР у верасні 1966 года ў горадзе Сочы. Там мне пашчасціла ў ліку амаль двух соцень спартсменаў спаборнічаць з будучым сярэбраным прызёрам Алімпійскіх гульняў у Мехіка, украінцам Мікалаем Авілавым. У Сочы я пераадолеў у скачках з шастом вышыню 3 метры 60 см. Але гэта не з шастом-катапультам з фібергласу, а са звычайным дзюралевым. Чаму мне запомніўся гэты вынік? Да гэтага асабісты рэкорд быў на 10 см меншы. А тут – 3 м 60 см. Была пачатковая вышыня. І я з ёю з трэцяй спробы справіўся. Такое застаецца ў памяці.

Таксама добра памятаю сумесныя выступленні і падтрымліваю

сяброўскія стасункі з шматразовым чэмпіёнам Беларусі, дзесяціборцам, майстрам спорту міжнароднага класа Іванам Адамовічам, які быў маім лепшым дарадцам і паплечнікам. Зараз ён яшчэ працуе на кафедры фізвыхавання Белдзяржуніверсітэта.

Не забываю і цудоўнага хлопца-дзесяціборца з Мастоў Іосіфа Лісая. Іосіф на пару гадоў маладзейшы за мяне. Вельмі доўга мы з ім аспрэчвалі першынство ў Гродзенскай вобласці. Тады ён не спазнаў асалоду чэмпіёнства. Але за тое, калі яму пераваліла за 40, ён, маючы ўпарты характар і вялікую сілу волі, стаў майстрам спорту па шматбор'ю і быў неаднаразовым чэмпіёнам Беларусі. Перад выхадам не пенсію, „асядлаў" ровар і стаў у адзіночку падарожнічаць па Беларусі і за яе межамі. Аб'ездзіў Крым, Еўропу, Скандынавію. Рызыкоўны, валявы, шчыры хлопец. Зусім нядаўна гасцяваў у мяне, дзяліўся ўражаннямі ад апошняга веласіпеднага падарожжа па Нарвегіі, Швецыі і Фінляндыі, паказваў сотні фотаздымкаў. У галаве ўзнікла думка, ці не перасесці мне з байдаркі на ровар?.. Але, здаецца, што трохі я спазніўся. Бо мне ўжо хутка 70. Рухаюся на мыліцах, але вада цягне да сябе. Фактычна ад водных падарожжаў я адпачываў толькі 3-4 гады, калі захварэў.

Калі Вы ажыццявілі свой першы водны паход?

– Першы водны паход арганізаваў з трэнерам Дзятлаўскай спартыўнай школы, якую я сем гадоў узначальваў. За пяць дзён мы адолелі нашу родную рэчку Моўчадзь на драўляных вёсельных лодках у чэрвені 1973 года. Новыя, непаўторныя краявіды за кожным паваротам ракі, ранішнія туманы, салаўіны спеў, водар берагавых бароў у перамежку з пахам свежаскошанай травы, прыемны водар прыгатаванай на вогнішчы гарбаты з чабору, нечаканыя сустрэчы з бабрамі, казулямі, чаплямі і іншымі прадстаўнікамі фаўны, захаваліся ў памяці і яны натхнялі на новыя падарожжы. І гэтыя падарожжы адбываліся штогод. Спачатку быў Нёман з яго прытокамі. А гэта Шчара, Дзітва, Бярэзіна, Ісլач. Пасля былі Карэлія, Карпаты, Каўказ, Саяны, Далёкі Усход, Алтай, Памір. Штогод два паходы самастойна ў складзе гарадзенскіх ці мінскіх турыстаў-воднікаў, і адзін-два – з вучнямі школ Дзятлава, у якіх я пазней працаваў. Вяршыняй маёй саракагадовай воднай адысеі было воднае падарожжа ў гарах Паміра па рацэ Мургаб-Бартанг, ад пасёлка Мургаб, праз Сарэзскае возера і Усойскі завал да горада Рушан у Горна-Бадахшанскай аўтаноміі Таджыкістана. Гэты паход быў вышэйшай шостай катэгорыі складанасці. Вядома ж, шмат было рызыкі, але яна апраўдвалася ўбачаным. Высачэзныя горы, чысцюткая вада ярка-блакітнага колеру, мясціны, дзе трапляюць сляды снежнага чалавека Іецці (Еццi), мы, праўда, іх не бачылі. А якое прыгожае Сарэзскае возера. У 1912 годзе кавалак горнага схілу, аб'ёмам больш 1 куб.м. з'ехаў у Мургаб, засыпаўшы і раку, і два пасяленні разам з людзьмі. Амаль на дваццаць гадоў Усойскі завал (назва ад засыпанай вёскі) спыніў плынь ракі. Утварылася возера глыбінёй 900 м. і даўжынёй каля 80 км. Сёння аб'ём вады ў ім каля 70 кіламетраў кубічных. Была вялікая небяспека, што вада пойдзе наверх і затопіць сотні вёсак і гарадоў на сваім шляху аж да Аральскага мора. Ваду ўтаймаваць вельмі складана, але яна паступова знайшла сама хады ў „целе" завала і праз 3-4 кіламетры вырываецца з яго са свістам дзесяткамі фантанаў. Вышыня некаторых дасягае 30 метраў. Над фантанамі зззяюць непаўторныя вясёлкі. Патокі зліваюцца ў адзін, утвараючы ўжо раку Бартанг. Паселішчы там невялікія, адно ад другога на дзесяткі кіламетраў. Жытло, памерам прыкладна 4х5-6 м., складзенае з каменя, з плоскім дахам, пакрытае тонкімі адшчэпамі ад горных парод. Падлога гліняная, частка яе засцелена саматканымі баваўнянымі дыванамі. Печ таксама з каменя. Хутчэй не печ, а каменны варыянт вогнішча ў адным з куткоў адзінага пакоя Сярэднявечча, не інакш. Пошта дастаўляецца туды 2-3 разы на месяц з Рушана, да якога больш за 100 кіламетраў. Дастаўляецца роварам, конна і нават пешшу. У экстранных выпадках па рацыі выклікаецца верталёт. Ім жа прывозяць тавары першай неабходнасці.

Карацей кажучы, я не шкадую, што столькі часу, па словах жонкі, „змарнаваў". Не адпачываў, як усе людзі, а толькі „замучваў" сябе. Але сёння ёсць што ўспомніць. Гарадзенскі журналіст і краязнавец Уладзімір Хільмановіч ужо шмат гадоў намагаецца мяне заставіць напісаць успаміны. На самай справе, кожны вандроўнік вандруе тройчы. Спачатку ў марах, вывучаючы маршрут, потым наяву і, нарэшце, ва ўспамінах. Калі я хварэў, было вельмі шмат часу падумаць, успомніць мінулае, то я ў думках вяртаўся на берагі бурлівых горных рэк, з асалодай успамінаў іх, падлічваў, колькі ж гэта часу, колькі дзён і начэй давялося пражыць у намётах? Атрымалася, што калі на кожны год выпадала два падарожжы ў сярэднім па дзесяць дзён, то 20х40 = 800. А яшчэ паходы ў школьныя гады, турыстычныя злёты і спаборніцтвы, выезды на прыроду з сям'ёй, экскурсіі на аўтобусах, на ўласным аўтамабілі на адпачынак, то атрымліваецца круглая лічба – 1000 дзён. Гэта два з паловай гады жыцця. Магчыма, калі Бог дасць яшчэ пажыць, то нешта напішу, прыгадаю…

Ведаю, што Вы па-ранейшаму вандруеце па мясцовых рэчках.

– Цяпер я не ў стане шукаць далёкія шляхі маршрутаў. А некалькі гадоў таму ў кампаніі сяброў-гарадзенцаў Уладзіміра Хільмановіча і

Віктара Парфененкі, якія натхнілі мяне на тое, каб я сеў у байдарку і за тры дні разам з імі прайшоў ад Крамяніцы да санаторыя „Радон” па знаёмай мне да дробязяў прыгажуні Моўчадзі. А праз год падоўжылі маршрут да вусця ракі і завяршылі воднае падарожжа ўжо на Нёмане за Беліцай.

Летам 2014 года мы вырашылі павандраваць па Шчары. У планах – новыя паходы па Шчары да яе вусця, а магчыма і да Мастоў.

Чым сёння жыве Дзятлаўшчына? Як ушаноўваецца памяць пра знакамітых людзей Вашага рэгіёну?

– У пачатку 2013 года намаганнямі мясцовых актывістаў і супрацоўнікаў Дзятлаўскага гісторыка-краязнаўчага музея адзначылі 100-гадовы юбілей майго бацькі – заснавальніка музея Петрыкевіча Міхаіла Фёдаравіча. А праз некалькі дзён у раённай бібліятэцы адбылася прэзентацыя яго кнігі „Народжаны вечнасць тварыць”. Актывіст з Бярозаўкі Сяргей Трафімчык у канцы 2014 года перадаў нам копію барэльефа Канстанціна Астрожскага (1460-1530) – заснавальніка і першага ўладара Дзятлава. Доўга мы шукалі месца, узгаднялі з уладамі, а цяпер прыкладаем намаганні, каб барэльеф па-мастацку аздобіць і замацаваць побач з мемарыяльным валуном, усталяваным яшчэ ў 1998 годзе на скрыжаванні вуліц Чырвонаармейскай і Слонімскай у гонар 500-годдзя з дня заснавання Дзятлава. Вельмі спадзяемся, што да абласнога свята Дажынак, які адбудзецца восенню 2015 года, барэльеф знойдзе сваё месца.

Шмат каму вядома, што побач з Дзятлавам у вёсцы Жыбуртоўшчына знаходзіцца сядзіба роднага дзядзькі, нашага славутага земляка, філамата, блізкага сябра Адама Міцкевіча, сусветна вядомага навукоўца, нацыянальнага героя Чылі Ігната Дамейкі. Тут ён, па волі лёсу, некалькі гадоў жыў і працаваў, хадзіў па вуліцах мястэчка, бываў на кірмашы, маліўся ў касцёле. Сядзібай і яе дапаможнымі пабудовамі доўгі час карысталася раённая бальніца. Сёння галоўны будынак стаіць з пашкоджаным дахам, гніе падлога, вокны і дзверы павыбіваныя. Некалі прыгожыя вадаёмы заплылі ілам і зараслі аерам і хмызняком. Сядзіба выстаўлена на аўкцыён, але няма пакупнікоў. Мы хочам захаваць сядзібу. Плануем звярнуцца ў пасольствы Чылі і Польшчы, каб аказалі нам матэрыяльную дапамогу, хаця б на кансервацыю.

Даўно марым аб увекавечанні памяці паўстанцаў-каліноўцаў каля вёскі Явар. Хочам там паставіць крыж і мемарыяльны камень. Таксама плануем устанавіць мемарыяльныя шыльды ўраджэнцам Дзятлава і раёна Тамашу Жаброўскаму, Вікенцію Дмахоўскаму, Пятру Граніту, Васілю Струменю і іншым землякам Дзятлаўскай зямлі.

Сяргей Чыгрын

Historia pewnej znajomości

Pamięci Aleksandry Bergmanowej – w 10. rocznicę śmierci

Tak chciałabym opowiedzieć tę historię Aleksandrze Bergman. Ale niestety, nie żyje od dziesięciu lat – zmarła 20 czerwca 2005 r. Ta historia zaczęła się u schyłku lat 80. minionego wieku. Gdyby nie Aleksandra Bergman i jej „Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej”, pewnie brat nigdy nie poznałby siostry, a siostra brata. Opowieść tę zacznę od końca.

Telefon od profesor Hanny Niżankowskiej

Jesienią 2006 r. usilnie poszukiwała mnie Hanna Niżankowska z Wrocławia, jak się potem okazało znana profesor okulistyki. Poszukiwała przez Uniwersytet w Białymstoku. Sekretarka z dziekanatu strzegła bardzo mojej prywatności, podając wreszcie dociekliwej pani z Wrocławia mój telefon domowy w Białymstoku, wiedząc przy tym, że praktycznie jestem trudno osiągalna pod tym numerem. Żeby tylko dała wreszcie spokój. Sekretarka wspominała mi o tym przy okazji. I pewnego grudniowego dnia po powrocie do domu po zajęciach w drzwiach przywitał mnie dzwonek telefonu: „Nazywam się Hanna Niżankowska. Dzwonię z Wrocławia i od dawna pani poszukuję. Jest pani członkiem naszej rodziny”. Zdumiałam się: „Ależ ja pani nie znam! A we Wrocławiu nie mam rodziny!”. Gdy zaczęłam tłumaczyć, że to pewnie pomyłka, usłyszałam: „Pani znalazła ślady mego teścia, o którym nasza rodzina nic nie wiedziała. Jesteśmy pani bardzo wdzięczni”. Nazwisko Niżankowska kojarzyło mi się z drugą żoną Bronisława Taraszkiewicza – Wierą Andrejeŭną i jej córką Ireną, z którą ciągle utrzymuję kontakty. Po dłuższej rozmowie okazało się, że drugi mąż Wiery Andrejeŭny, Władysław Niżankowski, był ojcem męża mojej rzmówczyni – Andrzeja.

Siła internetu – Kamunikat.org i „Listy” Mariana Pieciukiewicza

10 listopada 2006 r. Mariusz Niżankowski wpadł do domu rodziców przy ulicy Agrestowej we Wrocławiu z sensacyjną informacją. Mamę zastał w kuchni i zapytał: „Czy tata wie, że ma siostrę Irenę?”. Od dawna chciał się czegoś dowiedzieć o dziadku Niżankowskim, ale nikt z naj-

bliższych nie był w stanie nic mu powiedzieć. Tak się potoczyły losy kresowej rodziny nauczycielskiej, która doświadczyła najpierw wielkiej miłości, a następnie rozczarowania i rozstania. W zatarciu śladów skutecznie pomogła historia. Część przedwojennych mieszkańców Kresów w wyniku repatriacji znalazła się na tzw. Ziemiach Odzyskanych. Taki los stał się też udziałem małego Andrzeja Niżankowskiego, jego matki nauczycielki oraz jej drugiego męża, także nauczyciela, Rudolfa Gajczaka, ojczyma Andrzeja. Wychowywał go, był kochającym i opiekuńczym „tatkiem". W świadomości Andrzeja prawdziwy ojciec nie istniał, rodzice rozstali się, gdy miał 2-3 lata. Wiadomo było, że zginął w 1943 r.

Mariusz Niżankowski, szukając w internecie informacji o swym dziadku, trafił na krótki jego biogram w „Listach" Mariana Pieciukiewicza, wydanych przez Białoruskie Towarzystwo Historyczne w Białymstoku w 2005 r. (właściwie na początku 2006 r.). Jarosław Iwaniuk, prowadzący stronę internetową kamunikat.org, zamieścił je w tej wirtualnej bibliotece.

Władysław Niżankowski, Wiera Andrejeuna, Bronisław Taraszkiewicz

Pod jednym z listów Mariana Pieciukiewicza do Aleksandry Bergman z 1965 r. znalazły się krótkie informacje o Władysławie Niżankowskim (17.01.1904 Rawa Ruska, woj. lwowskie – 3.11.1943 Radoszkowicze), polskim nauczycielu, „który wcześniej pracował w szkole w Widzach; w Radoszkowiczach był dyrektorem szkoły powszechnej; po ślubie z Wierą Andrejewną został zwolniony z pracy i skierowany do szkoły podstawowej w Wadowicach; w l. 1939-1941 pracował w szkole w Radoszkowiczach, został zastrzelony przez partyzantów" (s. 55). O tym, że Władysław Niżankowski, drugi mąż Wiery Andrejeuny, był nauczycielem, wiedziałam od niej. Ale tak naprawdę, gdy odwiedzałam Wierę Andrejeuną w Radoszkowiczach w ciągu ostatnich dziesięciu lat jej życia, rozmawiałyśmy o Śnitkach, najwięcej o „Tarasie" (Bronisławie Taraszkiewiczu) oraz o innych działaczach białoruskich. Od niej dowiedziałam się, że w kościele w Radoszkowiczach ochrzczono klasyka literatury białoruskiej Jankę Kupałę. Chętnie opowiadała o dawnych czasach – o ojcu Andrzeju Śnitce, założycielu Muzeum Cerkiewno-Archeologicznego w Mińsku w 1912 r., o senatorze Aleksandrze Własowie, rodzonym bracie jej mamy, o przedstawieniu „Paulinka", o gimnazjum białoruskim w Radoszkowiczach, o Zambrzyckich – właścicielach majątku Wiazynka. Od niej po raz pierwszy usłyszałam o Stanisławie Swianiewiczu, wielkim przyjacielu Białorusinów, który przeżył Katyń i po wojnie napisał książkę „W cieniu Katynia", którą też po raz pierwszy zobaczyłam w jej radoszkowickim domu. Wszyscy ci ludzie ożywali we wspomnieniach Wiery Andrejeuny. Mimo wielu tragedii rodzinnych i nielekkich czasów zachowała niezwykłą pogodę ducha oraz doskonałą pamięć. Mówiła, że najnieszczęśliwszą datą w jej życiu był 15 czerwca – tego dnia w 1943 r. zginął jej ukochany syn Sławik, w 1954 r. – zmarła mama Jelizawieta, w 1969 r. – brat Andrzej. Mimo sędziwego wieku miała piękne rysy twarzy oraz arystokratyczne maniery. Kochała kwiaty – w jej ogródku pełno było różnokolorowych gladioli (mieczyków).

Wiera Śnitczanka urodziła się 21 lutego 1901 r. w majątku Karlsberg na Mińszczyźnie. Miała dwóch starszych braci – Usiewaład zginął w 1915 r. na froncie, Andrzej (urodzony w 1895 r.) po I wojnie światowej studiował w Pradze i tam pozostał do śmierci. Został pochowany na cmentarzu Olszańskim, niedaleko cerkwi.

Wiera uczyła się w gimnazjum żeńskim w Mińsku i w Smolnym Instytucie dla dobrze urodzonych panien. Po traktacie w Rydze ich majątek został przedzielony polsko-radziecką granicą państwową, która przebiegała niedaleko ich domu – tzw. „fermy". Ten znalazł się po polskiej stronie, podobnie jak folwark Mihauka Aleksandra Własowa. Większość ziemi z dworem pozostała za granicą. W 1922 r. odbywały się wybory do Sejmu i Senatu. Dziadźka Wiery, Aleksander, jako stary działacz białoruski (m.in. wydawca „Naszej Nivy" i „Sachi") zaangażował się w kampanię wyborczą i z Bloku Mniejszości Narodowej trafił do Senatu. Do jego Mihauki przyjeżdżali różni działacze białoruscy. Jednym z nich był autor gramatyki białoruskiej, dyrektor gimnazjum białoruskiego w Wilnie – Bronisław Taraszkiewicz (urodzony 20 stycznia 1892 r. w Maciuliszkach na Wileńszczyźnie). Zaimponował młodej Śnitczance manierami i kulturą. W wyniku wyborów został posłem na Sejm – był prezesem Klubu Białoruskiego. Wiera Śnitczanka była niezwykłej urody panną. W 1923 r. zawarła związek małżeński z „Tarasem" (jak do nazywała) – najpierw w cerkwi prawosławnej w Warszawie, a dwa tygodnie później w kościele św. Mikołaja w Wilnie ślubu udzielił ks. Adam Stankiewicz, również poseł na Sejm. 9 stycznia 1925 r. (na trzeci dzień prawosławnych świąt Bożego Narodzenia) urodził się syn Radosław (Sławik). Wtedy też szczęście rodzinne zostało zmącone wielką aktywnością polityczną Bronisława Taraszkiewicza – zaangażował się w tworzenie Białoruskiej Włościańsko-Robotniczej Hromady, która cieszyła się niezwykłą popularnością wśród ludności białoruskiej, rozczarowanej II Rzeczpospolitą, bowiem władze niewiele czyniły, by zrealizować białoruskie postulaty narodowe oraz polepszyć byt Białorusinów na Kresach. W styczniu 1927 r. Bronisława Taraszkiewicza wraz z innymi działaczami BWRH aresztowano, zarzucając im zdradę stanu, a BWRH zdelegalizowano. W wyniku procesu sądowego głównych aktywistów skazano na kary więzienia. Wierna żona „Tarasa" przeniosła się z Wilna do Radoszkowicz, wychowywała syna i odwiedzała męża w więzieniach, gdzie odsiadując wyrok tłumaczył na język białoruski „Pana Tadeusza" Adama Mickiewicza i „Iliadę" Homera. Po powtórnym aresztowaniu

w 1931 roku 6 września 1933 r. został wymieniony na białoruskiego dramaturga Franciszka Olechnowicza (więźnia Sołowek) i znalazł się w wymarzonej Białorusi. Stamtąd wysłano go do Instytutu Agrarnego w Moskwie, gdzie pracował do kolejnego aresztowania. Wiera z synem nie pojechała za nim do Związku Radzieckiego, gdyż żal jej było samotnej matki. Ojciec Andrzej zginął w 1920 r. na Ukrainie, gdzie rodzina Śnitków była w *bieżeństwie*.

Wiera została więc z synem w Radoszkowiczach. W 1932 roku do miasteczka przysłano nowego dyrektora szkoły powszechnej Władysława Niżankowskiego, wcześniej pracującego w Widzach, gdzie została jego żona Antonina z synem Andrzejem (urodzonym tam w 1931 r.). Odwiedzała go w Radoszkowiczach, ale samotnemu na co dzień dyrektorowi widocznie wpadła już w oko ciągle piękna Wiera Taraszkiewiczowa. Zresztą pewnie z wzajemnością. W 1934 r. „Taras" ożenił się w Moskwie po raz drugi z Niną Polańską. W 1936 r. Wiera wyszła za mąż za Władysława Niżankowskiego. 7 maja 1937 r. Bronisława Taraszkiewicza aresztowano pod zarzutem szpiegostwa na rzecz Polski i 29 listopada 1938 r. rozstrzelano w Mińsku w ramach czystek stalinowskich.

Irena i Andrzej

Za „pierwszych sowietów" (po 17 września 1939 r.) Niżankowscy z matką Jelizawietą i Sławikiem musieli opuścić rodzinny dom – urządzono w nim szpital. Wynajęli mieszkanie przy rynku, niedaleko kościoła. Szczęśliwie udało im się uniknąć deportacji na wschód. Miejscowi zebrali podpisy, żeby ich zostawić na miejscu – Jelizawieta Śnitkowa leczyła ludzi, stanowiąc nawet konkurencję dla miejscowych lekarzy.

26 maja 1940 r. w rodzinie Wiery i Władysława Niżankowskiego urodziła się córka Irena. Sławik miał wówczas 15 lat. Jesienią 1943 r. trafił do oddziału partyzanckiego. Zginął pod sam koniec wojny – 15 czerwca 1944 r. w okolicach Behomla (na północ od Mińska) i spoczął w zbiorowej mogile. Wcześniej – 3 listopada 1943 r. – zginął tragicznie Władysław Niżankowski.

W czasie okupacji niemieckiej Niżankowcy z rodziną wrócili do służbówki, w której i dziś mieszka Irena. Obecnie do domu prowadzi ulica Bronisława Taraszkiewicza. Wiera Andrejeuna zmarła 6 maja 1998 r. i spoczęła na miejscowym cmentarzu, obok męża i matki oraz symbolicznej mogiły syna. Za życia nie doczekała się należnego upamiętnienia „Tarasa", choć w niepodległej Białorusi marzyła o muzeum. Nie oddano jej też ani domu, ani ziemi z majątku Karlsberg.

Na początku 2005 r., opracowując listy Mariana Pieciukiewicza do Aleksandry Bergman, zadzwoniłam do Ireny do Radoszkowicz, by podała podstawowe dane o swym ojcu, który tak naprawdę mnie wcześniej nie interesował. Marian Pieciukiewicz w liście do Aleksandry Bergman napisał w 1965 r., że znał osobiście Wierę Andrejewną, że wyszła ona za mąż po raz drugi. Potrzebny był przypis, tym bardziej, że Marian Pieciukiewicz nie pamiętał nazwiska jej męża.

Okazało się, że Irena pamięta ojca jak przez mgłę. Wspomniała, że po rozwodzie z pierwszą żoną i ślubie z jej mamą władze oświatowe pozbawiły go posady kierownika szkoły w Radoszkowiczach i wysłały do pracy w Wadowicach. Przez rok uczył tam małe dzieci, a potem rzucił rzucił pracę i wrócił do Radoszkowicz. Zarządzał majątkiem teściowej, pracując na gospodarce. Za „pierwszych sowietów" otrzymał posadę nauczyciela w szkole białoruskiej, chociaż słabo władał tym językiem. W czasie okupacji niemieckiej zarządzał majątkiem żony i pewnego razu (3 listopada 1943 r.), gdy wiózł robotników, został zastrzelony przez partyzantów, którzy wzięli go za Niemca. Władysława Niżankowskiego zgubiła pasja samochodowa, gdyż



Wiera Taraszkiewicza (pierwsza żona Bronisława Taraszkiewicza). *Źródło: Aleksandra Bergman, „Rzecz o Bronisławie Taraszkiewiczu", Książka i Wiedza, Warszawa 1977*

Ze zbiorów Hanny i Andrzeja Niżankowskich



Antonina z Zapotockich i Władysław Niżankowscy (początek lat 30. XX w.)

przesiadł się za kierownicę, mimo że obok siedział kierowca – Niemiec, który natychmiast zawrócił do Radoszkowicz. Władysława Niżankowskiego pochowano na miejscowym cmentarzu.

Po wojnie nie było łatwo. Kobiety nadal mieszkały w służbówce, ich dom nadal zajmował szpital. Po wojnie Radoszkowicze były mocno zniszczone. Wiera Andrejeuna zaczęła pracować jako księgowa w rejonowym centrum zdrowia. Przed emeryturą musiała jeszcze pracować jako księgowa w szkole. Irena uczyła się w miejscowej białorusko-rosyjskiej szkole. Od dzieciństwa chorowała. Po ukończeniu dziesięciolatki podjęła pracę w centrali telefonicznej w Radoszkowiczach, a następnie w Mińsku. Historia zawsze ją pasjonowała. Potrafi o niej pięknie opowiadać.

W 1954 r. zmarła Jelizawieta Śnitko – mama Wiery. Z czasem przyszło zainteresowanie Bronisławem Taraszkiewiczem jako białoruskim bohaterem narodowym i Aleksandrem Własowem jako wydawcą „Naszej Niwy". Ulicy, prowadzącej do „Fermy", jak nazywano jej posiadłość, nadano imię przywódcy Hromady. Wiera Andrejeuna chętnie przyjmowała gości – historyków, krajoznawców, etnografów, dzieliła się wspomnieniami. W sowieckiej rzeczywistości nic innego jej nie pozostawało. Zawsze towarzyszyła jej córka Irena, którą wychowała w duchu poszanowania dla przodków oraz białoruskiego patriotyzmu. Pamiętam, jak pewnego dnia, odprowadzając mnie w Radoszkowiczach, powiedziała, że chociaż jej ojciec był Polakiem, ona jest Białorusinką. Tak została wychowana przez mamę.

Andrzej Niżankowski urodził się 10 sierpnia 1931 r. w Widzach na Brasławszczyźnie. Dzieciństwo do roku 1945 spędził w Drui, gdzie przeniosła się jego matka wraz z ojczymem, Rudolfem Gajczakiem. Z nim po rozwodzie, przeprowadzonym przez Sąd Konsystorski Kościoła Ewangelicko-Reformowanego w Wilnie, zawarła ślub w tymże Kościele 5 lipca 1936 r. W 1938 r. Andrzej rozpoczął naukę w szkole powszechnej w Drui, przerwaną w czasie wojny i kontynuowaną przez matkę, która utrzymywała się w czasie okupacji z dorywczej pracy. Jej mąż walczył w partyzantce AK, a po wkroczeniu Sowietów został wywieziony na Syberię. W maju 1945 roku, po uzyskaniu zezwolenia na „repatriację", Andrzej z matką osiedlili się w mieście Góra na Dolnym Śląsku, gdzie w 1946 r. po powrocie z Kaługi odnalazł ich ojczym. Oboje rodzice podjęli pracę jako nauczyciele. Andrzej rozpoczął naukę w drugiej klasie gimnazjum, którą kontynuował w liceum ogólnokształcącym do 1951 r. W 1956 r. ukończył wydział mechaniczny na Politechnice Wrocławskiej.

Pracę zawodową rozpoczął jako pracownik naukowo-dydaktyczny w macierzystej uczelni. Do przemysłu przeniósł się w 1959 r., gdy we Wrocławiu zaczęto organizować Zakłady Elektroniczne ELWRO. Został tam zatrudniony na stanowisku głównego technologa. Bardzo zaangażowany emocjonalnie w organizację tej nowatorskiej gałęzi przemysłu, stworzył koncepcję i opracowanie graficzne logo ELWRO – zakładów, w których wyprodukowano pierwszy w Polsce komputer UMC-1. Pracę zawodową zakończył w Instytucie Komputerowych Systemów Automatyki i Pomiarów we Wrocławiu, w 2005 r.

W 1959 r. Andrzej założył własną rodzinę – 9 maja ożenił się z absolwentką Wydziału Lekarskiego Akademii Medycznej we Wrocławiu, Marią Hanną Klimczewską. W latach studenckich oboje ukochali Wrocław i z nim związali życie swoje i kolejnych pokoleń. Tu 15 kwietnia 1962 r. urodził się ich syn Mariusz, który poszedł w ślady ojca – ukończył wydział mechaniczny Politechniki Wrocławskiej, ale zawodowo pozostał związany z komputerami. Jest ojcem Filipa Rafała – studenta architektury (1991 rocznik) i Agaty Dominiki – studentki medycyny (1993 rocznik). Pasjonuje się od niedawna dziejami rodziny Niżankowskich.

Aleksandra Bergman

O tym, że w Radoszkowiczach mieszka żona Bronisława Taraszkiewicza, powiedziała mi w 1987 r. Aleksandra Bergman. Pisząc o nim książkę, kilkakrotnie ją odwiedzała, potem korespondowała. Były niemal równolatkami. Aleksandra Bergman, a właściwie Chawa Kuczkowska, urodziła się 1 maja 1906 r. w Grodnie. W 1923 r. ukończyła klasyczne gimnazjum Waldmana, w którym zetknęła się z ruchem komunistycznym. Będąc działaczką Komunistycznej Partii Zachodniej Białorusi, poznała męża Stefana Bergmana (Beniamina Epsztejna), za którego wyszła za mąż w 1931 r. W 1934 r. wyjechała do Mińska, gdzie urodziła


Ze zbiorów Eleonory Bergman

Aleksandra i Stefan Bergmanowie na urlopie w Gołdapi, 1978 r.

córkę Zofię (Zorę). 6 listopada 1935 r. został aresztowany Stefan Bergman, a w grudniu Aleksandra. Byli zesłani do łagrów na Syberii. Spotkali się dopiero po wojnie w Polsce, dokąd pierwszy powrócił Stefan i zadbał o powrót żony. Początkowo osiedli w Łodzi. W 1947 r. urodziła się tam córka Eleonora. W 1948 r. przeprowadzili się do Warszawy wraz z wydawnictwem KC PPR „Książka", w którym pracował Stefan. Aleksandra po przejściu w 1958 r. na rentę zaczęła zajmować się działalnością naukowo-badawczą, początkowo w zakresie ruchu robotniczego, a następnie białoruskiego ruchu narodowego. Akurat w 1956 r. powstało Białoruskie Towarzystwo Społeczno-Kulturalne i białoruskojęzyczny tygodnik „Niva". Tam w kole naukowym poznała Mariana Pieciukiewicza (ur. w 1904 r.), który znał Bronisława Taraszkiewicza i jego żonę. Wiele pomógł jej przy pisaniu książki „Rzecz o Bronisławie Taraszkiewiczu". Właściwie poza Aleksandrą Bergman w Polsce w latach 60. i 70. ubiegłego wieku nie prowadzono badań nad historią Białorusi. Dołączył do niej Jerzy Turonek, który polemizował z nią na łamach „Niwy".

Ёсць невялікая згадка пра Уладзіміра Урбановіча ў „Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі" (Мн., 1987. Т.5. С.364), дзе напісана, што ён з'яўляецца і аўтарам шэрагу артыкулаў па методыцы выкладання беларускай літаратуры, арганізацыі навучальнага працэсу, спалучэння школьных і пазашкольных заняткаў. На тэму краязнаўства ў выкладанні беларускай літаратуры ў старэйшых класах, роля краязнаўчага матэрыялу ў патрыятычным выхаванні вучняў, краязнаўства на службе у настаўнікаў рускай і беларускай мовах, эстэтычнае выхаванне ў паходах па роднаму краю – і дзесяткі іншых распрацаваных настаўнікам-краязнаўцам Урбановічам таксама не састарэлі і сёння, бо іх смела можна прымяняць у школах, гімназіях і ліцэях. У 1965 годзе Міністэрства адукацыі БССР зацвердзіла праграму настаўніка з Валеўкі, якая называлася „Праграма літаратурна-краязнаўчых гуртkоў для васьмігадовых і сярэдніх школ і пазашкольных дзіцячых устаноў". Праўда, гэта далёка не ўсё я пералічыў тое, што ім зроблена, напісана, апублікавана і знаходзіцца ў рукапісах. Чалавек, жывучы ў глыбінцы, дзеля беларускай справы працаваў даволі сур'ёзна і актыўна. Да яго звярталіся па дапамогу і параду навукоўцы, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў, педагогі, архівісты і літаратуразнаўцы з усёй Беларусі, а таксама з Літвы, Польшчы, Украіны. Уладзімір Урбановіч вёў вялікую пе-

рапіску, тысячы пісем ад вялікіх людзей, на жаль, згубіліся, але і шмат захавалася ў беларускіх архівах і музеях, у прыватных сховішчах. Уладзімір Урбановіч сябраваў амаль з усімі дзеячамі беларускай культуры і пісьменнікамі. У яго доме і ў школе ў Валеўцы шмат разоў пабывалі Максім Танк, Уладзімір Караткевіч, Янка Брыль, Генадзь Кахаnоўскі, Уладзімір Калеснік, Ігар Лучанок, Аляксей Карпюк, Барыс Сачанка, Анатоль Вярцінскі, Пятрусь Макаль, Фёдар Янкоўскі, Ян Скрыган, сваякі Якуба Коласа і Адама Міцкевіча і сотні іншых вядомых нам асобаў. Ён заўсёды знаёміў гасцей з Валеўкай, школьным музеем і вядома ж адвозіў іх на Свіцязь, дзе частаў, дзе вяліся шчырыя гутаркі пра Беларусь, родную мову і культуру…

Сам Уладзімір Урбановіч нарадзіўся 2 жніўня 1921 года ў вёсцы Пудзіна на Лідчыне ў сялянскай сям'і. У 1932 годзе скончыў пяць класаў і працаваў на гаспадарцы, займаўся самаадукацыяй. У 1938 годзе экстэрнам здаў экзамен за сямігодку і ў 1939 годзе паступіў у Жыровіцкую польскую сельскагаспадарчую гімназію Слонімскага павета. Пры „саветах" зноў здаваў экзамены за 7 класаў і паступіў у Мінскі палітэхнікум. Падчас акупацыі скончыў настаўніцкія курсы ў Навагрудку, пасля якіх працаваў настаўнікам у пачатковых класах у Лідзе і ў вёсцы Біскупцы на Лідчыне. Пасля вайны завочна скончыў Лідскую педагагічную вучэльню і літаратурны факультэт Гродзенскага педінстытута. А калі скончыў педінстытут, то ўладкаваўся настаўнікам роднай мовы і літаратуры ў Райцаўскую сярэднюю школу Карэліцкага раёна, а з 1959 года – працаваў у Валеўскай сярэдняй школе Навагрудскага раёна.



Наваградчына.Злева направа Уладзімір Урбановіч, Васіль Бондар і Ян Скрыган, 1960-я гады

За сваю педагагічную і краязнаўчую дзейнасць Уладзімір Урбановіч быў унагароджаны рознымі граматамі і дыпломамі, а таксама значком „Выдатнік народнай асветы". Ён так пры жыцці і не адрымаў звання заслужны работнік культуры ці заслужаны настаўнік Беларусі. І толькі пасля смерці (памёр 2 лютага 1999 года ў Валеўцы, дзе і пахаваны), яго пасмяротна занеслі ў Кнігу Славы Навагрудскага раёна.

Чытачам „Czasopisu" прапаную лісты да Уладзіміра Урбановіча.

Сяргей Чыгрын

Лісты да Уладзіміра Урбановіча

16 лістапада 1955 года, Мінск

Паважаны Уладзімір Аляксандравіч!

Я многа атрымаў тэлеграм і пісем з усяго Саюза з віншаваннямі ў сувязі з прысваеннем ганаровага звання народны артыст СССР, але такіх, як Ваша, на роднай мне мове, было нямнога.

Паслаў Вам складзеную мною кнігу „Беларускія песні". Там ёсць адна балада („Што то за хлопец, што за дзяўчына"), якая вельмі пераклікаецца са „Свіцязянкай" Адама Міцкевіча. Прасачыце, ці не знойдзеце гэтага тэкста і ў Вас. Песня паходзіць з Карэліцкага раёна. Хацелася мне вельмі завітаць да Вас, паглядзець на Свіцязь і ваколіцы, але без Вашай згоды не адважыўся, і дарогі не ведаю добра…

Будзеце ў Мінску – не мінайце.

З праўдзіваю пашанаю і любоўю –

Ваш Рыгор Шырма.

24 красавіка 1961 года, Мінск

Паважаны Уладзімір Аляксандравіч!

Дарагія мае юныя сябры!

Пісьмо ваша атрымаў і рад бы вам дапамагчы, але непасрэднага апісання вёскі Нізок і яе навакольнай прыроды ў маіх творах няма. Сёе-тое вы можаце знайсці

ў рамане „Мядзведзічы”. У гэтым творы пейзаж мае шмат агульнага з нізаўскімі мясцінамі, некаторыя ўрочышчы, палі, лясныя дзялянкі захавалі свае сапраўдныя назвы, а некаторыя з жыхароў вёскі паслужылі прататыпамі для вобразаў рамана.

Аднак раман пісаўся амаль трыццаць гадоў таму назад, і з таго часу шмат што змянілася. Балота, за якое мядзведзіцкія сяляне змагаліся з князем Радзівілам, асушана, стары лес навакол Нізка высечаны і на яго месцы вырас малады і ўжо таксама вялікі. Большасць тых людзей, што ў той ці іншай меры паслужылі мне для стварэння вобразаў рамана, ужо няма на свеце. І сама вёска, жыхары якой цяпер складаюць адну з брыгад калгаса „Чырвоны кастрычнік”, так змянілася, што я сам яе ледзь пазнаў, калі наведаў пасля доўгага перапынку.

Хаты, у якой я нарадзіўся, таксама няма. На другім баку вуліцы на гэтай сядзібе пабудавана другая хата, у якой жыве мая сястра-калгасніца.

Вось кароценька некаторыя звесткі аб маёй роднай вёсцы.

Жадаю вам поспеху ў вучобе, працы і ў вашым краязнаўчым падарожжы.

Кандрат Крапіва

29 снежня 1967 года, Мінск

Паважаны Уладзімір Аляксандравіч!

Ваш артыкул пра падарожжа па коласаўскіх мясцінах уяўляе цікавасць. Хоць факты адносна прататыпаў трылогіі ўжо называліся ў друку, у нарысе яны дарэчы... Я лічу, што „Полымя” зробіць добрую справу, надрукаваўшы Ваш артыкул.

Рыгор Шкраба

1 студзеня 1971 года, Мінск

Дарагога Уладзіміра Аляксандравіча сардэчна віншую з Новым годам. Жадаю ўсяго найлепшага ў жыцці.

З павагаю

Рыгор Шырма

24 лістапада 1971 года, Вільнюс

Паважаны і дарагі Калега!

Прашу прабачэння, што не адразу выканаў Вашу просьбу. Акрамя таго выканаў вельмі пасрэдна.

Прашу Вас пры перакладзе артыкула надаць тлумачэнні. Можна і папраўляць – усё на Ваш погляд.


Пра генеалогію паэта мала ведаю. Чытаў аб Рымвідах, якія паходзілі недалёка з-пад Ліды. Болей нічога канкрэтнага не сустракаў.

Рады, што Вы цвёрда стаіце на дабрачыннай пазіцыі краязнаўца. Жадаю поспехаў і здароўя.

Хачу толькі запытаць: можа што цікавае маеце ў сваёй бібліятэцы з гісторыі Вільнюскага ўніверсітэта. Хутка юбілей і я гэтым займаюся.

З павай

Ваш Ч. Кудаба.





16 лютага 1972 года, Мінск

Дарагі Уладзімір Аляксандравіч!

У 1928 годзе ў Мінску я пазнаёміўся з Алесем Салагубам. Было гэта ў Доме пісьменніка на Савецкай вуліцы. У знак нашай дружбы мы абмяняліся шалікамі. Я даў Алесю Феафілавічу шоўкавы фабрычны шалік, а ён мне даў просты шарсцяны, звязаны рукамі яго маці. У дзень нашага знаёмства мы разам сфатаграфаваліся. Нашы сустрэчы былі частымі. Алесь цікавіўся беларускай савецкай літаратурай, а я – літаратурай Заходняй Беларусі. У дзень нашага знаёмства я пазнаёміў Алеся з Петрусём Броўкам. Усе мы тады былі маладымі, любілі жартаваць. Алесь пачынаў забывацца пра цяжкія часы зняволення ў польскіх турмах. Не раз давялося мне з Алесем Салагубам выступаць у рабочых клубах Мінска, чытаць свае вершы. Алесь быў сарамлівым хлопцам, варта было каму-небудзь з незнаёмых людзей загаварыць з ім, і ён адразу чырванеў і аглядаўся.

У Мінску, пасля таго, як Алесь Салагуб скончыў універсітэт, ён стаў дамаседам. Рэдка калі бываў за горадам. Гэта тлумачылася і тым, што ён не меў тут сваякоў, мала меў знаёмых. Са мною яму давялося некалькі разоў пабыць у маіх бацькоў. Нават у вясёлай кампаніі, калі хлопцы-літаратары крышку хмялелі, Алесь быў маўклівым. Яго хіліла на сон, пацеў і адпрашваўся пайсці адпачыць, паспаць. Відаць, у яго ўжо было падношанае сэрца, здавалася, што іншы раз яму нехапала паветра. Такім застаўся ў маёй памяці Алесь Салагуб.

У 1936 годзе, у часы культу асобы, мы былі пазбаўлены волі. Алесь загінуў у 1937 годзе, а я прасядзеў звыш года ў турмах, а пасля аж да 14 лістапада 1944 года быў у лагеры. У 1946 годзе вярнуўся на Міншчыну, а з 1949 года зноў быў арыштаваны і ў 1950 годзе высланы ў Сібір. Вярнуўся адтуль я толькі ў 1956 годзе.

Я хачу напісаць нарыс пра Алеся Салагуба. Калі ў Вас знойдзуцца новыя матэрыялы пра яго, дык буду Вам удзячны за іх.

З павагай і добразычлівасцю –

Станіслаў Шушкевіч

5 жніўня 1973 года, Гародня

Дарагі Уладзімір Аляксандравіч!

Шчыра дзякую Вам і ўсім Вашым за аказаную мне сардэчную, цёплую, бацькоўскую гасціннасць, за ўсе клопаты, праяўлення да маёй асобы членамі Вашай сям'і ў час прыбывання ў Вашым доме.

Выконваю Вашу просьбу. Высылаю Вам кніжку „Pani Eliza", прыблізную схему населеных пунктаў, звязаных з жыццём і творчай дзейнасцю пісьменніцы Э. Ажэшкі, і крыху матэрыялаў для абсталявання стэнда акадэміка Яф. Карскага для Ятрынскай пачатковай школы.

Уладзімір Аляксандравіч, калі будзеце ў Гродна, не забывайце наведаць старога сябру…

Шчырае прывітанне Вам ад землякоў, блізкіх і знаёмых. Жадаю творчых поспехаў у вашай пачэснай справе на ніве роднай культуры.

З сардэчным прывітаннем –

Апанас Цыхун

16 студзеня 1976 года, Мінск

Паважаны Уладзімір Аляксандравіч!

Дасылаем Вам планавую работу в.а. дацэнта кафедры беларускай літаратуры Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна тав. Царанкова Л. А. „Асновы методыкі выкладання беларускай літаратуры ў сярэдняй школе" і просім Вас даць аб ёй водзыў. Работа гэта – дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў універсітэтаў і педагагічных інстытутаў БССР.

Кафедры вельмі важна мець Ваш водзыў, як перадавога педагога-славесніка з вялікім стажам, чалавека, які мае друкаваныя працы, у тым ліку і кнігі па методыцы выкладання роднай літаратуры ў школе. У рэцэнзіі хацелася б атрымаць Вашы заўвагі і суджэнні аб рукапісу тав. Царанкова Л.А., як станоўчага, так і адмоўнага планаў.

Рэцэнзію просім напісаць у двух экзэмплярах, заверыць свой подпіс у дырэктара школы з пячаццю школы і разам з рукапісам выслаць у адрас Л. А. Царанкова.

Зараней удзячны Вам.

Загадчыца кафедры дацэнт Вольга Казлова.

1 жніўня 1979 года, Мінск

Шаноўны Уладзімір Аляксандравіч!

Даруйце, што жадаю вам клопату, але хачу і Вас не абысці, каб пасля не охкаць і шкадаваць. Рэч вось у чым. На лета спаўняецца 100-годдзе Гальяша Леўчыка. Ці часамі ў Вас, ці ў Вашым музеі няма якіх-небудзь матэрыялаў (вершы друкаваныя і рукапісныя і іншыя творы, успаміны каго-небудзь, фота і г.д.), што тычацца Леўчыкавай асобы.

У выдавецтве „Мастацкая літаратура" павінен выйсці зборнічак твораў паэта, дык пакуль яшчэ туды можна было б што-нішто новае „уманціраваць". Буду вельмі ўдзячны, калі напішаце мне, і назавеце хоць бібліяграфічна, што Вы маеце або не маеце.

З пашанаю –

Янка Саламевіч

20 студзеня 1985 года, Маладзечна

Дарагі Уладзімір Аляксандравіч!

Рэдакцыя нашай энцыклапедыі даручыла мне напісаць пра Вас артыкул для новага выдання ЭліМБеЛ. Вядома, без Вашай дапамогі мне ніяк не абыйсціся.

Дык, калі ласка, выручайце. Структуру такога артыкула Вы ўяўляеце. Дзе нарадзіліся, што закончылі, калі пачалі друкавацца, што выдалі, калі пачалі ствараць музей, у якіх школах настаўнічалі, што ёсць напісанага

па педагогіцы?.. Словам, чым больш, тым лепш. Вось тэрмін мне абмежавалі да 2 лютага 1985 года. Спадзяюся, што не пакрыўдзяцца на мяне, калі я артыкул пра Вас дастаўлю на дзень-другі пазней. Але ж Вам позніцца не выпадае.

Вось такая прыемная навіна. Зрэшты, у свой час я настойваў, каб Вас уключылі ў энцыклапедыю. Дык мне і даручылі напісаць.

Усяго Вам найлепшага, чакаю хуткага адказу.

Ваш Генадзь Каханоўскі.

P.S. Не забудзьце, калі ўдзельнічалі ў вайне, то абавязкова адзначце.

27 красавіка 1987 года, Вільня

Дарагія Валодзя і Ганна!

Пачну з „кошкі". Не прыпамінаю нават, каб я не адклікаўся на пісьмы, прывітанні. Праўда, бывае так, што даю адказ са спазненнем. Вось і цяпер прайшло больш месяца пакуль сабраўся даць адказ на тваё вялікае і вельмі змястоўнае пісьмо. Асноўная прычына не лянота, а клопаты і турботы, звязаныя з пярэбарамі на новую кватэру. Так што ніякая котка не прабягала і не можа прабегчы. Няўжо вы не ведаеце, што Цябе і Ганну я заўсёды цаніў і шанаваў, як добрых, сумленных педагогаў, людзей з пачуццём адказнасці за сваю работу. Гэта тыя якасці, за якія цяпер у нас ідзе барацьба.

Тваё пісьмо выклікала розныя пачуцці: радасць, задавальненне тым, што я атрымаў даволі падробную інфармацыю пра Валеўскія навіны, асабліва школьныя, а таксама смутак, горыч ад таго, што ў цябе склаліся такія абставіны, аб якіх ты пішаш. Цяжка паверыць у гэта. І я не паверыў бы, каб не было фактаў. Я думаю, што гэта адрыжка, нейкія астанкі культаўскага перыяду.

Чытаў твае кніжкі, маю іх з сабою цяпер і магу смела сказаць, што ніякага нацыяналізму там няма. Ёсць пачуццё любові да роднага краю, да роднай культуры, традыцый, прыроды, пашаны да людзей нашага краю. Дык хіба ж гэта дрэнна? Добра ведаю, што краязнаўства цяпер развіваецца, падтрымліваецца Міністэрствам асветы, культуры і другімі органамі ўлады. Гэта ярка відаць у Літоўскай рэспубліцы. Любоў да роднага краю дапамагае вырашыць важную дзяржаўную праблему – замацаванне кадраў, рабочых рук у сельскай гаспадарцы. Не менш важныя і другія аспекты краязнаўчай работы. Прыпамінаецца наш першы турыстычны паход па Наваградчыне ў 1954 годзе, у якім ты быў са мной разам. Гэта было навінкай не толькі ў Карэліцкім, але і ў Наваградскім раёнах. Гэта быў пачатак школьнага турызму. Прайшло больш за трыццаць гадоў, але і цяпер успамінаецца з прыемнасцю.

Не ведаю, праз якія акуляры тыя твае субяседнікі разглядалі твае кнігі. А можа яны і не чыталі, а хто-небудзь з зайздрасці даў ім адмоўную рэцэнзію. І гэта можа быць. Разумеецца, з гэтай закваскі, як кажуць, піва не зварыш, але нервы папсаваць можна. Спачуваю табе, ведаю, як цяжка ўсё гэта перажыць. Тут можна сказаць словамі Янкі Купалы: „Чаго вам хочацца, панове, які вас выклікаў прымус?..". Згодзен поўнасцю з тваёй ацэнкай Ускова, амаль 16 гадоў працавалі разам. Толькі правільна ў прыказцы сказана: каб добра пазнаць чалавека – пуд солі трэба разам з'есці. Здзіўляюся, што Бязмен стаў настаўнікам-метадыстам. Вось якая ўраджайная глеба ў Валеўцы – палавіна настаўнікаў – метадысты. Што ж, „бывают чудеса".

Толькі чаму гэтыя метадысты пазбавілі школу яе лепшых традыцый, разгубілі тое, што збіралася гадамі?.. Разумееш, хвалююся, пачаў пісаць хутка і неразборліва.

А наконт дэндрарыя, пастарайся пагаварыць, калі не паможа – напісаць у „Настаўніцкую газету" ці ў другую якую. Падтрымліваю тваю думку даслаць рукапіс пра Адама Міцкевіча Янку Брылю. Шкада, што няма Бондара. Ён не дапусціў бы такога развалу. З ім можна было працаваць (значна лепш, чым са Скарабагацькам), школу ён любіў, дбаў пра яе аўтарытэт, падтрымліваў заўсёды любую добрую справу (па турызму, па дэндрарыю, па музею і г.д.).

Цяпер пару слоў пра сябе. Ключы ад кватэры атрымаў, ужо тыдняў два начую там, а есці прыходжу да дачкі Светы. Барысаўна пакуль на старым месцы. Здабылі і паставілі мэблю ў пакоях, але яшчэ не ўсю. Няма яшчэ абстаноўкі на кухні. Кватэра светлая, вокны на поўдзень, другі паверх (надакучыла сядзець на канапе, як у шпакоўні), усё ж бліжэй да зямлі. Канчай работу ў садзе-агародзе і прыязджайце з Ганнай на наваселле. Будзем рады сустрэць. Паведаміце, калі будзеце ехаць – прыеду на аўтобусную і сустрэну. Разам пагасцім і ў Светы. Яна жыве блізка ад нас – метраў 500 не больш. Бо мы сёлета, відаць, не зможам нідзе далёка паехаць. Пабудзем толькі пару дзён у Дзятлаве, на Свіцязі і ў Любчы. Такія ў нас планы.

Канчаю і магу сказаць – да хуткага пабачання, сустрэчы! Прывітанне ад усіх нашых – Барысаўны, Светы, Жэні і дзяцей, унукаў.

Міхась Петрыкевіч

Дзень і месяц не пазначаны,1980 года, Вільнюс

Паважаны Уладзімір Аляксандравіч!

Выпадкова даведалася, што Вы з'яўляецеся адным з прыхільнікаў творчасці Адама Міцкевіча. Таму звяртаюся да Вас з просьбай наконт папаўнення экспанатамі, нядаўна адкрытага музея-кватэры Адама Міцкевіча пры Вільнюскім універсітэце.

Экспанатаў у музеі пакуль няшмат: тры партрэты, два скульптурныя партрэты і каля 30 кніг – ранніх выданняў паэта. Для нашага музея выдаткоўваюцца

сродкі і мне б хацелася набыць у вас усё мажлівае: раннія выданні Міцкевіча, літаратуру пра яго, пераклады, партрэты, малюнкі – словам усё, што звязана з паэтам, яго сябрамі-філаматамі і яго каханай Марыляй Верашчака.

З павагаю –

Загадчыца музея-кватэры Адама Міцкевіча Вільнюскага ўніверсітэата Яніна Ліміновіч.

29 студзеня 1992 года, Любча

Шаноўны Уладзімір Аляксандравіч!

Прачытаў Ваша пісьмо і падумаў, што мала яснасці магу ўнесці ў пытанне пра вызваленне з астрога Валянцціна Таўлая. Але што ведаю, тое раскажу. Пра тое, што ён жыў і працаваў сакратаром Валковіцкай воласці ў часы нямецкай акупацыі, я сам даведаўся з успамінаў яго жонкі, а перад арыштам ён працаваў у Наваградскай БНС, якую ўзначальваў тады спадар Якуцэвіч. І, напэўна (гэта мая думка), калі Таўлай папаў у Лідзе ў лапы гестапа, Барыс Рагуля і Павел Якуцэвіч вырашылі яго ратаваць супольнымі сіламі. Як ніяк, але Таўлай быў нам знаёмы, як добры паэт, і шкада было, каб яго талент загінуў без пары.

Вядома ж, ратаваць яго спадручней было Барысу, паколькі ў яго была большая магчымасць атрымаць транспарт у нямецкіх уладаў. Ён гэтую магчымасць выкарыстаў. Узяў у сваё распараджэнне некалькі машын, загадаў мне, Крамко Язэпу, Янку Прасняку і яшчэ некалькім хлопцам збірацца ў дарогу. Мэту маездкі не скрываў, а сказаў: „Паедзем ратаваць, вызваляць з рук Лідскага гестапа Валянціна Таўлая…”. Гэтыя яго словы помню як сёння. Вядома ж, мы адчувалі сябе ў вялікай адказнасці за выкананне гэтай незвычайнай (на той час) місіі. Хаця мы разумелі, што з рук гестапа жывым мала хто выходзіў. Праўда, сваёй ролі ў выкананні гэтага задання мы не ўяўлялі. Перш за ўсё мы былі ўзброеныя аўтаматамі, ахоўвай Барыса і яго нямецкіх спадарожнікаў, бо дарога да Ліды была небяспечнай, маглі наскочыць на міну, а то нарвацца на партызанскую засаду. Тым больш, што ў той час на Лідчыне швэндаліся яшчэ польскія АКоўцы.

У Ліду заехалі без прыгод, затрымаліся там перад будынкам Лідскага гестапа. Барыс са сваімі спадарожнымі немцамі зніклі ў тым змрочным будынку, а мы чакалі каля машын. Праз пэўны час Барыс вярнуўся і, праходзячы каля машын, сказаў: „Усё добра, заўтра яго выпусцяць”.

На гэтым наша вызваленчая місія скончылася і мы паехалі дамоў у Наваградак. Вось і ўсё, што я магу Вам распавесці пра вызваленне Таўлая з рук Лідскага гестапа. Пра гэта я пісаць нікуды не збіраюся, а пра Барыса Рагулю, як добрага і гуманнага чалавека, я мог бы расказаць не мала, але перш чым сесці пісаць гэты ліст, я знайшоў у сябе два нумары наваградскай раённай газеты „Новае жыццё” за 1988 год. У нумары за 11 чэрвеня пад загалоўкам „Пярэварацень” нейкі журналіст Жалкоўскі друкуе ўспаміны камандзіра атрада партызана В. Панчанкава, а за 6 жніўня – нейкі Кавалёў у матэрыяле „Успамінай „спадар” былое” столькі вылілі бруду на Барыса і, наогул, на рагуляўцаў, што недасведчаны чытач можа чорт ведае што пра іх падумаць. Але тады яны пісаць іначай не маглі. І цяпер я думаю, што мала знойдзецца адважных, каб правільна ацаніць падзеі таго часу. Ведаю Барыса з маленства, бо мы з адной вёскі Ачукевічы. Барыс вучыўся на медыцынскім факультэце Віленскага ўніверсітэта. Бацька ягоны Зміцер таксама быў фельчарам і памёр у мястэчку Мір ад тыфусу пасля Першай сусветнай вайны. Рос Барыс сіратой. Служыў у Польскай арміі падхарунжым. У 1939 годзе ў польска-нямецкую вайну папаў да немцаў у палон. Пра гэты факт Вам больш змог бы расказаць Яцукевіч Лаўрэн (цесць Мазалеўскага Славы – дырэктара Свіцязянскага пансіяната), які доўга жыве ў сваіх зяця і дачкі. У 1940 годзе з палону ўцёк і працаваў настаўнікам фізкультуры ў Любчанскай сярэдняй школе. Тут яму і прычапілі ярлык нямецкага шпіёна. І пасля некалькіх месяцаў турмы ў Мінску, калі распачалася вайна, яму ўдалося ўцячы з эшалона падчас нямецкай бамбёжкі чыгуначнага палатна за Мінскам. Вярнуўся не чалавек, а шкілет, абцягнуты шкурай са слядамі жорсткіх катаванняў. Бачыў я гэта ўласнымі вачамі, калі ён набіраўся сіл на беразе роднага Нёмана. І нехта хацеў бы, каб ён ішоў служыць сваім катам. Каб не пачалася вайна – не мінуць бы яму Курапатаў. Праўда, смерць маці ад нямецкай бомбы лягла цяжкім цяжарам на яго сэрца, але гэта… непазбежныя ахвяры вайны ў якой загінула мноства нявінных цывільных людзей. У мяне часам паўстае такое пытанне. Чаму Наваградскі і Любчанскі раёны найменш пацярпелі ад нямецкіх карнікаў і партызанскіх рабаванняў? Ды таму, што ў абарону насельніцтва выступаў Барыс Рагуля са сваім швадронам, а пасля і батальёнам. Нікога яны не абрабавалі, нікога не спалілі, нікога не расстралялі. І ўсе гэтыя выдумкі несумленных журналістаў.

Аб высокароднасці Барыса могуць сведчыць часткова ўспаміны Яцука, які досыць станоўча апісаў паводзіны Барыса падчас яго наведвання на кватэры ў Наваградку з прапановай партызан перайсці са ўсёй камандай на іх бок. Яго мэтай была арганізацыя баяздольнай вайсковай адзінкі будучай беларускай арміі. І ён у душы вельмі шкадаваў, што дапамогу ў гэтай справе прыходзіцца прымаць ад фашысцкай Германіі. Ды толькі іншага шляху тады не было. Калі вакол арганізоўваліся ў вайсковыя злучэнні белыя палякі і чырвоныя бальшавікі, беларусам таксама трэба было прымаць у гэтым накірунку свае захады. Аднак, як заўсёды беларусы спазняліся са сваімі задумамі, хоць на гэты раз не па сваёй віне. Ведаў Барыс, што некаторыя яго падначаленыя

маюць сувязь з партызанамі, але па сваёй гуманнасці, ніякія меры супраць іх не прымаў. А гэта часам прыносіла вялікую шкоду яго дзейнасці.

Аб яго душэўнай дабраце яшчэ сведчыць такі факт. Калі наш батальён быў у Докшыцкім раёне ў 1944 годзе, у адной бязлюднай вёсцы аказаўся самотны хлопчык гадоў 12-13, адзінокі і безпрытульны. Барыс забраў яго да сябе, як належыць абмундзіраваў і сваімі бацькоўскімі адносінамі, так запаланіў хлопчыку душу, што той нікуды ад Барыса не адыходзіўся. Не ведаю, які далейшы лёс гэтага хлопчыка, нават не помню яго імя, бо я трапіў там у вайсковую Глыбоцкую бальніцу і потым мая сувязь з батальёнам і Барысам абарвалася. Пачалося хутка наступленне савецкіх войск, фронт пакаціўся на захад. Шпіталь эвакуіравалі, а я трапіў у Вільню, дзе знаходзіўся аж пакуль мяне ў 1945 годзе не арыштавалі і не пасадзілі ў мінскую „амерыканку". За мной зачыніліся дзверы на 10 гадоў ГУЛагу (Тайшэт і Магадан). Шмат пра што можна было б яшчэ напісаць, але для пачатку хопіць, бо, можа, Вам ужо і чытаць апрыкрала брэдні старога дзеда. Мне ўжо 76 гадоў.

Бывайце здаровы.

Уладзімір Сіўко

P.S. Праглядаючы часопіс „Беларусь" № 12 за 1991 год маю ўвагу прыцягнуў невялікі допіс пра нашых землякоў за мяжой пад загалоўкам „Балада пра заснавальніка „Полацка" у ЗША". Згадка пра Сяргея Карніловіча, які 12-13-гадовым хлопчыкам з Докшыц, апынуўся ў ЗША. Яго гісторыя мне вельмі нагадала таго хлопчыка, што прытуліў Барыс Рагуля. Вельмі цікава, хацелася б даведацца пра яго лёс больш падрабязней. Раю пачытаць. Пашукайце той нумар.

14 кастрычніка 1993 года, Гродна

Шаноўны Уладзімір Аляксандравіч!

Гродзенскае абласное аддзяленне Беларускага фонду культуры з 1994 года пачынае выданне рэгіянальнага гістарычна-культурнага часопіса „Свіцязь". Часопіс мяркуецца выдаваць накладам да трох тысяч, чатыры разы ў год.

Часопіс „Свяцязь" будзе друкаваць на сваіх старонках матэрыялы па гісторыі і культуры Гродзеншчыны, а таксама этнаграфічна блізкіх беларускіх абшараў: Усходняй Беласточчыны, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Калініградскай вобласці.

Мы ведаем Вас, шаноўны Уладзімір Аляксандравіч, як цікавага і глыбокага знаўцу гісторыі і культуры рэгёна і шчыра запрашаем супрацоўнічаць у часопісе. Будзем удзячны, калі Вы прышлеце пісьмова свае меркаванні адносна нашай прапановы, зместу і асноўных накірункаў дзейнасці часопіса.

З павагай,

Старшыня праўлення, прафесар Сяргей Габрусевіч

26 сакавіка 1994 года, Мінск

Дарагі Уладзімір Аляксандравіч!

Учора апоўдні атрымаў Ваша пісьмо, адразу патэлефанаваў Данілу Канстанцінавічу, а ён пад вечар патэлефанаваў мне так:

Музей Якуба Коласа звяртаўся да старшыні рэспубліканскага камітэта па ахове прыроды Анатоля Максімавіча Дарафеева, і той растлумачыў музею сутнасць справы. Дуб Даніла дайшоў да такога старэчага стану, што стаў пагрозай для людзей. Ужо было адно трагічнае здарэнне забіты дзве дзяўчыны. Лёс дуба вырашала адпаведная камісія. А жалуды ягоныя пасаджаны – як нашчадкі…

Вось так. Пішу Вам і згадваецца таполя каля музея Янкі Купалы, якую паваліў вецер, дубы Міцкевіча ў Шчорсах і ў Варончы.

Час робіць сваё…

Жадаю Вам усяго добрага!

Янка Брыль

20 снежня 1996 года, Мінск

Дарагі Уладзімір Аляксандравіч!

І вас з Новым годам! І Вам найлепшыя пажаданні, перш за ўсё – добрага здароўя, дый дома, нікуды далёка не ездзячы.

Так і думалася, што Вы або не атрымалі майго вясковага пісьма, або дрэнна сябе адчуваеце.

Што з Вамі? Буду рад, калі напішаце пару слоў, тым больш дасць Бог пра тое, што належна паздаравелі і адчуваеце сябе значна святлей, без таго песімізму, які ў Вашым пісьме засмучае мяне, бо я прывык і бачыць, і ўяўляць Вас заўсёды ўраўнаважаным, упэўненым, як бы цяжка ды сумна ў жыцці не бывала. Не хачу выглядаць перад Вамі „бодрячком", які другіх пацяшае, а сам паскавытвае ўпотай ад нашай вертыкальнай рэчаіснасці. Цяжка, вядома, бывае і мне, як усім нам, аднак жа неяк трэба трымацца і верыць, што ёсць жа Бог і над намі. Трохі працую, удзельнічаю ў грамадскім жыцці, па звычаю многа чытаю, перазвоньваюся з сябрамі, якіх усё менш і менш. Нічога не зробіш – старасць. Шкада толькі, што яна прышлася на такі шалёны час…


Пайшла ў набор мая новая кніга, можа, як-небудзь і выйдзе, хоць і цяжка сёння трымацца ў нейкай упэўненасці.

Міша Петрыкевіч пісаў мне ў самым пачатку года. Неяк бачыўся на кангрэсе 18.Х. з яго сынам, казаў, што „бацька трымаецца, нават актыўна".

З жонкай Калесніка падрыхтавалі яго выбранае ў трох тамах, яно ляжыць у выдавецтве без руху, а мы бадзёра займаемся яго ўспамінамі, якіх сабралася старонак на 600, а то і больш машынапісу.

Яшчэ раз – усяго добрага!

Янка Брыль. ■



Календарыюм

Ліпень-жнівень – гадоў таму

1015 – у ліпені 1000 г. памерла князёўна полацкая, вялікая княгіня кіеўская Рагнеда. Разам з сынам Ізяславам адрадзіла беларускую, крывіцкую дзяржаву – Полацкае Княства. Першая ігуменьня ў Беларусі, у манастве – Анастасія.

755 – 13 ліпеня 1260 г. войскі старабеларускай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага разбілі крыжакоў каля возера Дурбе.

745 – 1270 г. пачатак панаваньня ў Вялікім Княстве Літоўскім князя Трайдэна (Трайдзеня), які ўзмоцніў старабеларускую дзяржаву (пам. у 1282 г.).

625 – 14 жніўня 1385 г. была падпісана ў Крэве персанальная вунія паміж вялікім князем Ягайлам (хрысьціянскае-праваслаўнае імя Якаў) і парадстаўнікамі Каралеўства Польскага.

605 – 15 ліпеня 1410 г. Грунвальдзкая бітва. Войскі Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага разбілі крыжацкія войскі ды іх саюзьнікаў.

495 – 1.08.1520 г. нар. Жыгімонт II Аўгуст, вялікі князь ВКЛ у 1548-1572 гг. і кароль Польшчы з 1548 г., ініцыятар Люблінскай уніі 1569 г. Пам. 23.06.1572 г.

485 – у 1530 г. нарадзіўся Сымон Будны, выдатны асьветнік, пісьменьнік, грамадзкі ды рэлігійны дзеяч. Аўтар філязофска-тэалягічнага твору „Пра найважнейшыя артыкулы хрысьціянскай веры". Памёр (быў забіты) 13.11.1593 г. у Вішневе.

400 – 3.08.1615 г. пам. Кшыштаф Мікалай Дарагастайскі (нар. 2.03.1562 г.), дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, кальвініст, аўтар кнігі „Гіпіка" (1603) – першага ў Рэчы Паспалітай дапаможніка па конегадоўлі; каля 1615 г. у маёнтку Ашмяна Мураваная на яго сродкі была заснаваная друкарня.

335 – 25.08.1680 г. пам. Сімяон Полацкі (нар. у1629 г.), беларускі паэт і асьветнік, рэлігійны дзеяч.

300 – 6.08.1715 г. у Гембулах Лідскага пав. нар. Мацей Догель, гісторык-археограф, прававед, аўтар „Дыпламатычнага кодэксу Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага ў 3 тамах (1758-1764)". Пам. 24.02.1760 г.

175 – 25.07.1840 г. у в. Азяты каля Жабінкі нар. Юльян Крачкоўскі, беларускі фальклярыст, этнограф, гісторык, пэдагог. Памёр 27.07.1903 г.

175 – 6.08.1840 г. у Калацічах каля Глуска нар. Альгерд Абуховіч, пачынальнік жанру байкі ў беларускай літаратуры. Памёр 22.08.1899 г. Пахаваны ў Слуцку.

170 – 12.08.1845 г. пам. Юзаф Маралёўскі (нар. 5.03.1777 г. у Гарадку каля Віцебска), паэт і пэдагог. Закончыў езуіцкі калегіюм у Полацку, быў настаўнікам у езуіцкіх калегіюмах, у 1818 г. пераехаў на Валынь.

160 – 19.07.1855 г. пам. Тамаш Зан (нар. 21.12.1796 г. у Мясоце Навагрудзкага пав.), паэт-рамантык, сябра Адама Міцкевіча. З 1841 г. жыў у Кахачыне каля Оршы. Пахаваны ў Смалянах – магіла захавалася.

155 – 21.07.1860 г. у маёнтку Ярылаўка Гродзенскай губ. нар. Антон Каменскі, ілюстратар і графік. Вучыўся ў Мастацкай акадэміі ў Пецярбурзе і ў Акадэміі Юльяна ў Парыжы, з 1894 г. жыў у Варшаве, супрацоўнічаў з „Tygodnikiem Ilustrowanym", дзе зьмяшчаў свае працы, у час першай сусьветнай вайны быў у Парыжы, вярнуўся у 1919 г. у Варшаву. Пам. 12.09.1933 г. і пахаваны на Павонзках.

135 – 20.07.1880 г. у Слоніме нар. Гальяш Леўчык, беларускі паэт, аўтар зборніка «Чыжык беларускі» (Вільня 1922). Жыў у Варшаве, дзе загінуў у час вайны ў 1944 г.

130 – 30.08.1885 г. пам. Юльян Корсак (нар. 13.02.1806 г. у Слоніме), паэт і перакладчык, з 1829 г. жыў у Пецярбурзе, у 1830 г. вярнуўся ў в. Страла каля Дзятлава. Апошнія гады жыцьця правёў у Навагradку.

125 – 28.07.1890 г. у Рушчанах на Беласточчыне нар. Язэп Рэшаць, каталіцкі сьвятар і беларускі дзеяч. Памёр 15.02.1958 г. у ЗША.

125 – 9.08.1890 г. у в. Чамяры каля Слоніма нар. Максім Бурсевіч, дзеяч Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады. Расстраляны саветамі 3.11.1937 г.

120 – 23.08.1895 г. пам. Міхал Эльвіра Андрыёлі (нар. 2.11.1836 г. у Вільні), мастак, удзельнік студзеньскага паўстаньня, пасьля якога жыў у Парыжы і ў Лондане. У 1866 г. вярнуўся на радзіму і быў сасланы ў Сібір. Жыў у Вятцы. У 1871 г. вярнуўся адтуль і пасяліўся ў Варшаве, быў ілюстратарам „Kłosów” і „Tygodnika Ilustrowanego”. Ілюстраваў творы м. інш. У. Сыракомлі, Э. Ажэшкі, Ю. І. Крашэўскага, А. Міцкевіча.
115 – 10.07.1900 г. у вёсцы Стаўрова, Браслаўскага павету нар. Пётра Сергіевіч, выдатны беларускі мастак. Вядомыя яго творы „Кастусь Каліноўскі сярод паўстанцаў”, „К. Каліноўскі і В. Врублеўскі робяць агляд паўстанцаў», маляваў пэйзажы Віленшчыны. Памёр 1.11.1984 г. у Вільні, пахаваны на Антокальскім вайсковым могільніку.
115 – 15.07.1900 г. у вёсцы Агароднікі, Вілейскага павету нарадзіўся Уладзімір Дубоўка, выдатны беларускі паэт, празаік, перакладчык, крытык, палымяны абаронца роднай мовы. Друкавацца пачаў з 1921 г. Арыштаваны НКВД 20.07.1930 г., сасланы ў глыб Расіі. З 1937 г. вязень ГУЛАГ-у. Выйшаў на волю ў палове 50-ых гадоў. Памёр 20.03.1976 г.
110 – 6.07.1905 г. нарадзіўся Пятро Глебка паэт, грамадзкі дзеяч. Друкаваўся з1925 г. Адзін з самых адданых выхваляльнікаў камунізму ды Сталіна. Памёр 18.12.1969 г.
105 – 3.07. 1910 г. у вёсцы Міхнаўка каля Ляўкова Старога на Беласточчыне нарадзіўся Аляксей Грыцук, грамадзкі дзеяч, гісторык, літаратуразнавец, настаўнік. З 1948 г. жыў у Канадзе, з’яўляўся шматгадовым старшынёй Згуртаваньня Беларусаў Канады. Памёр 30.05.1976 г.
105 – 27.07.1910 г. пам. Уладыслаў Дыбоўскі (нар. 18.04.1838 г. у Адамарыне Вілейскага пав.), заолаг, батанік, палеантоляг, мінералог і фальклярыст. Закончыў Дэрпцкі унівэрсытэт, у якім працаваў з 1871 г., у 1878 г. пераехаў у Навагрдчыну, дасьледаваў флёру і фаўну Навагрдчыны, збіраў беларускі фальклёр.
105 – 7.08.1910 г. нарадзіўся Генадзь Цітовіч, выдатны дзеяч беларускага харавога мастацтва, кампазітар, дырыжор. Сабраў ды апрацаваў многа беларускіх народных песьняў. Заснавальнік і кіраўнік Дзяржаўнага Акадэмічнага Хору Беларусі (зараз хору прысвоена ягонае імя). Памёр 20.06.1986 г.
105 – 9.08.1910 г. у былым маёнтку Жлобаўцы нарадзілася Ларыса Геніюш (дзявочае прозьвішча Міклашэвіч), выдатная паэтка, грамадзкі дзеяч, адраджэнец. Друкавалася з 1939 г. Першы яе паэтычны зборнік „Ад родных ніў” быў выдадзены ў Празе ў 1942 г. У 1948 г. разам з мужам Янкам былі пазбаўлены Чэхаславацкага грамадзянства ды былі арыштаваны НКВД. Неўзабаве Вярхоўны суд БССР прысудзіў ім 25 год папраўча-працоўных лагераў. Выйшла на волю ў 1956 г., жыла (без грамадзянства) у Зэльве на Гарадзеншчыне, шмат пісала. Памерла 7.03.1983 г., пахавана на Зэльвенскім могільніку.
100 – 7.08.1915 г. перастала выходзіць „Наша Ніва” (друкавалася з 10.11.1906 г.). Часопіс адыграў найважнейшую ролю ў беларускім адраджэньні пачатку XX ст.
100 – 28.08.1915 г. у в. Бойдаты на Гарадзеншчыне нарадзіўся Часлаў Найдзюк, грамадзкі дзеяч. Дзеяч Беларускага Студэнцкага Саюзу ў міжваеннай Вільні, арганізатар беларускага жыцьця ў Каліфорніі (ЗША). Памёр 28.03.1995 г.
95 – 28.07.1920 г. у Кракаве памёр Алесь Гарун (Прушынскі – нар. 11.03.1887 г. у фальварку Новы Двор пад Менскам), беларускі паэт. Пахаваны ў Кракаве на Ракавіцкіх могілках.
95 – 1.08.1920 г. абвешчана Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі.
95 – 14.08.1920 г. т. зв. „Цуд над Віслай” у польска-савецкай вайне. Пачатак паразаў Чырвонай Арміі.
90 – 19.08.1925 г. у Вільні выйшаў з друку першы нумар газэты „Жыцьцё Беларуса” (выдавалася 3 разы ў тыдзень), рэдагаванай Я. Туркевічам. Зьвязана яна была зь Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамадой. Апошні нумар у выніку рэпрэсіі ўладаў быў выдадзены 12.11.1925 г.
70 – 25.07.1945 г. памёр на дызентэрыю на адным з этапаў падчас зьняволеньня НКВД д-р Станіслаў Грынкевіч, лекар, культурна-грамадзка-палітычны дзеяч, пісьменьнік, свядомы Беларус. Нарадзіўся 2.02.1902 г. у Новым Двары на Сакольшчыне.
60 – 23.08.1955 г. у Братыславе памёр Іван Краскоўскі (нар. 24.06.1880 г. у Дубічах Бельскага павету на Беласточчыне), дзеяч нацыянальнага руху, быў між іншым у 1920 г. старшынёй Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні, з 1922 г. дырэктарам Дзьвінскай Беларускай Гімназіі.
30 – 15.08.1985 г. памёр у ЗША Часлаў Будзька, беларускі грамадзкі дзеяч, гісторык, настаўнік (нар. 29.06.1913 г. у Вільні).
25 – 27.07.1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэклярацыю Аб Дзяржаўным Сувэрэнітэце БССР. Дзяржаўнае сьвята Рэспублікі Беларусь да 1995 г.
25 – у начы з 12 на 13 ліпеня 1990 г. была падпалена ды згарэла царква Праабражэньня Гасподняга на Сьв. Гары Грабарцы.
25 – 13-15 ліпеня 1990 г. у Гарадку адбыўся I Фэстываль Музыкі Маладой Беларусі сарганізаваны Беларускім Аб’яднаньнем Студэнтаў ды Гмінным Асяродкам Культуры ў Гарадку. Выступалі між іншым Сяржук Сокалаў-Воюш, гурты „Уліс”, „Мроя”.
20 – 7.08.1995 г. памёр Максім Танк (сапраўднае прозьвішча Яўген Скурко) паэт, грамадзкі дзеяч (нар. 17.09.1912 у в. Пількаўшчына на Вілейшчыне).

Апрацавалі **Лена Глагоўская** і **Вячаслаў Харужы** ■

Мястэчка Сухаволя

У «Беларускім Дню» з 1927 г. знайшла я карэспандэнцыю з Сухаволі – «Сухавольскага». Магчыма, што пад гэтай мянушкай скрываецца Янка Зенюк, які працаваў у гэтай газэце. Выдавалася яна Франціўшкам Умястоўскім у Вільні ў 1927-1928 гг. Янка быў братам Адольфа Зенюка, актыўнага ўдзельніка Гродзенскага гуртка беларускай моладзі (1909-1914), які закончыў права ў Віленскім унівэрсытеце і працаваў у 30-ыя (1934) гады судзьдзёй у Сандомежы. У Літоўскім Цэнтральным Дзяржаўным Архіве ў Вільні у фондзе Віленскага Унівэрсытэту захоўваюцца асабовыя дакуманты Адольфа (F. 175, Ap. 2VICa, B. 184) і Яна Зенюкоў (F. 175, Ap. 2VICa, B. 999), як студэнтаў права. Былі яны каталікамі, якія сьведама падавалі беларускую нацыянальнасьць. Шмат разоў пробвала я адшукаць іх сьляды ў Сухаволі – нажаль беспасьпяхова. Можа нехта з чытачоў дапаможа? Прапаную таксама іхнія „życiorysy" ў арыгінале.

Лена Глагоўская

Сухаволя, Сакольскага павету

Мястэчка Сухаволя, гэта найдалей на захад высуненае беларускае мястэчка. Да вайны польскія ўплывы ў Сакольшчыне былі малыя. Ішлі яны на вёску праз касьцёл, дзякуючы таму, што ксяндзы польскія ідэнтыфікавалі каталіцызм з польскасьцяй і вырабілася паняцьце... польскае веры. Польска-каталіцкае духавенства з мэтаю дэнацыяналізацыі якраз і працуе ў тым кірунку, каб не пазволіць людзям адрозьніваць каталіцкае веры ад польскае нацыянальнасьці. Бо кожны ведае, што палякоў у Сакольшчыне няма, па-за элемэнтам наплывовым і вясковай інтэлігэнуыяй, а часта толькі псэда-інтэлігэнцыяй, якая выраклася свайго роднага, дзеля розных карысьцяў, зьвязаных з польскасьцяй. Частка беларускае інтэлігэнцыі, якая мусіць працаваць у Сакольшчыне або якая змушана сядзець на вёсцы, не праяўляе ніякай дзейнасьці дзякуючы таму, што зьвязана найчасьцей з роўнымі благімі пасьледхтвамі. Але што народ тут беларускі, аб гэтым ня можа быць ніякіх спрэчак. Ксяндзы беларусы, якія за лепшых часаў маглі спраўляць свае рэл. ійныя абавязкі і ў Сухаволі, цешыліся вялікім паважаньнем і найлепш зжывалися з вёскаю. А было гэтак, перш за ўсё, таму, што былі яны беларусамі, і пабеларуску думалі. Сялянстваў Сакольшчыне наагул, як і ўсюды, цяпер перажывае гаспадарскі крызыс, які няведама скончыцца. Цяжка жывецца тутэйшаму гаспадару, ён ледзь зьвязвае канец з канцом.

Ніякага грасадзкага жыцьця Сухаволя не праяўляе. Праўда, у гэтым годзе мястэчка перашло на хутарную гаспадарку, так што гэта можна залічыць да вялікага поступу. Але зьяўляючыся сьведкам барацьбы якая вялася проціў хутароў, аж верыць ня хочацца, як шмат яшчэ ёсьць цёмных, а часта і подлых людзей. Гаспадарскіх арганізацыяў, так як няма, бо абсолютна нічога ў гэтай галіне ня робіцца. Ніхто аб гэтым ня дбае, старыя гаспадары нічым не цікавяцца, а моладзь дык зусім нічога добрага ня робіць. Час траціла на п'янстве, пустых гульнях, а часта і бойках. Ня было каму парупіцца, аб нашай моладзі. Некалькі год таму быў у Сухаволі ксёндз, беларус, ён дык умеў з'арганізаваць моладзь і тады моладзь пачала цікавіцца культурнымі справамі. Але ксёндз, беларус ці-ж мог доўга пасядзець на месцы? Пераньсьлі, а разам з тым і арганізацыя ўпала.

Толькі ў гэтым годзе моладзь пачала кратацца. Дзякуючы ізноў ксяндзу, але ўжо паляку, паўстала „Stowarzyszenie Młodzieży Polskiej". Арганізацыя гэта нібы апалітычная, а запраўды дык чыста эндэцка-клерыкальная, якой у Вільні патронуе сам п. Обст. Моладзь ня дужа ахвотна там пашла. А некаторыя пасьля выступілі. Бо куды сялянскім сыном, сыном крывавага мазаля, належаць да арганізацыяў эндэцка-клерыкальных! Пэўна маласьведамая моладзь там асталася. Цікава, што адзін мне нават знаёмы хлапец, якога ўсе лічылі за разумнагаі паважнага, так паддаўся ксяндзоўскім уплывам, што ніяк ня можна яго пераканаць аб шкоднасьці такіх арганізацыяў. Хлапец гэты, праўда, зьяўляецца "вялікім прэзэсам" арганізацыі, можа лічыць за гонар тое, што можа штодня відзець і вітацца з вікарым, арганістым і іншымі маламестачковымі інтэлігэнтамі. Ня гонар гэта – ніякі, не. Наадварот, выглядае гэта на лякайства, а ніхто не спадзяваўся лякайства па ём. Другая, частка моладзі арганізавала „Strzelca", але нічога там, апрача ваеншчыны, ня робіцца. Культурнае працы няма ніякае, а таму і карысьці з ваеншчыны мала. Моладзь наагул дзічэе. Школьны будынак прыгожы, але навука вядзецца ня надта добра. І нічога дзіўнага. Настаўнік з Галіцыі, мо' гэта і нічога кепскага. Але ёсьць сярод іх адзін налаговы алькаголік, які вінен у кожнай карчме, які ня толькі ў корчмах п'ець водку, але прыносіць да школы, дзе аднаго разу пачатую бутэльку знайшлі. Вось такі чалавек вучыць нашых дзяцей. Дзе тут інспэктар, які хіба ведае аб штучках гэтага настаўніка, бо гэта не тайніца ў Сухаволі, што гэны настаўнік кожнага першага, замест грошай, адтрымлівае з пошты толькі зьвернены вэксьлі. Такога настаўніка, ужо жаўно не павінна быць. Хай едзе там, скуль родам.

Словам мала ёсьць рэчаў у Сухаволі, якія-б цешылі. Людзям кепска жывецца – не вядзецца ніякай культурнай працы, сьведамасьць беларуская ўзрастае памалу.

Адно толькі, што чалавека цешыць, што не пазваляе губляць добрай думкі на будучыну, гэта тое, што моладзь з Сакольшчыны, якая вучыцца вышэй, у гімназіях, часта ў унівэрсытэтах, ня кідае, свайго роднага, а нацыянальна сьвядомая. А сьвядомая і ідэйная беларуская інтэлігэнцыя гэта залог лепшай будучыны.

Сухавольскі

«Беларускі Дзень», № 23, 20.08.1927, с. 9-10

Życiorys

Urodziłem się w Suchowoli, z. Grodzieńskiej w roku 1894 [14 kwietnia – przyp. H. G.]. W 1909 roku wstąpiłem do gimnazjum w Grodnie do klasy IV. W 1914 r. ukończyłem je. Tegoż roku wstąpiłem na wydział prawny uniwersytetu w Petersburgu, gdzie przesłuchałem 4 semestry i zdałem 6 egzaminów. W 1916 roku zostałem powołany do wojska z odesłaniem mię do szkoły wojskowej w Kijowie, którą po 5-cio miesięcznym pobycie ukończyłem. W styczniu roku 1918 zwolniono mnie z wojska, a w maju tegoż roku wróciłem do Suchowoli.

W 1918 roku brałem udział w Polskiej Organizacji Wojskowej. W 1918 roku byłem mianowany przez Organ Samorządowy Powiatu Sokólskiego, tak zw. Radę Powiatową, członkiem Komisji Szacunkowej, spisującej straty wojenne. Na posadzie tej zostawałem od marca do maja miesiąca, kiedy wstąpiłem do Urzędu Powiatowego, podówczas Komisarjatu. Na tem stanowisku, jako referent, byłem do czerwca miesiąca 1920 roku i opuściłem je wobec inwazji bolszewickiej oraz wstąpienia mego jako ochotnik do Wojska Polskiego.

W wojsku służyłem do m-ca grudnia 1920, a po zdemobilizowaniu w marcu 1921 roku byłem przyjęty na Wydział Prawa i nauk politycznych Uniwersytetu Warszawskiego.

Jednak wobec krytycznego stanu majątkowego rodziców, zniszczonych przez bolszewików, nie byłem w stanie uczęszczać na wykłady.

W roku 1922 wystąpiłem z Uniwersytetu Warszawskiego, mając zamiar wyjechać za granicę do brata.

Pracowałem w instytucji kooperatywnej t.zw. Stowarzyszeniu Rolnicz. Handlowem w Sokółce, gdzie byłem jej założycielem i przez rok członkiem Dyrekcji.

Adolf Zeniuk

12 września 1923 r., Wilno

Życiorys

Urodziłem się 26 lutego 1905 roku w m. Suchowoli, pow. Sokólskiego, woj. Białostockiego. Rodzice: Paweł i Zofja z Misiewiczów, właściciele drobnego gospodarstwa rolnego w m. Suchowoli. Nauki początkowe pobierałem w rosyjskiej szkole ludowej w m. Suchowoli. W r. 1915 na skutek inwazji niemieckiej wyjechałem z bratem do Petersburga. W Petersburgu uczęszczałem do szkoły polskiej. W r. 1917 wyjechałem do Mińska i uczęszczałem do Gimnazjum Polskiego do klasy pierwszej i drugiej. W roku 1918 powróciłem do Polski i w roku 1919 wstąpiłem do IV klasy Gimnazjum Państwowego im. Adama Mickiewicza w Grodnie, gdzie uczyłem się do r. 1923 i ukończyłem sześć klas. W roku 1923 przeniosłem się do klasy siódmej Gimnazjum Państwowego im. Św. Kazimierza w Nowej Wilejce, które ukończyłem w r. 1925. W r. 1925/26 wstąpiłem na Wydział Prawny U.S.B. w Wilnie.

Studja na wydziale prawnym U.S.B. przerwałem, będąc na II-gim kursie w r. 1928/29 z braku środków na dalsze studja i konieczność zarobkowania. W r. 1929/30 odbywałem służbę wojskową w Szkole Podchorążych w Krakowie. W roku 1931 zmarł mi ojciec i z tego powodu nie mogłem kontynuować przerwanych studjów.

Od lutego 1931 do grudnia 1933 pracowałem w T-wie Miejskich i Międzymaistowych Komunikacyj Autobusowych w Wilnie.

Jan Zeniuk

Wilno, 4 października 1934 r. ■

Leon Moenke Tundra

7. Na szczęście wiatr nam sprzyjał i pies nie mógł nas zwęszyć. Posuwając się dalej, pozostawiliśmy za sobą i tę „przyjemność”. Jednocześnie wybrnęliśmy z wąskiego miejsca doliny, gdzie prostopadłe skaliste urwiska przypierały nas ku samej rzece i wiosce. Góry szerokim półkolem otaczały wieś i nic nam innego nie pozostawało, jak iść wzdłuż nich skrajem lasu.

Gdyśmy osiągnęli przeciwległy kraniec, myśleliśmy, że już okrążyliśmy wieś. Niestety. Wlazłszy na górę ujrzeliśmy, iż na przeciwległym brzegu rzeki znajduje się dalszy ciąg wsi. Tutaj również ujrzeliśmy solidny, dominujący nad innymi, gmach z antenami. Nie ulegało wątpliwości, iż jest to posterunek pograniczny GPU.

Znów trzeba było, zachowując wszelkie ostrożności, prześlizgiwać się dalej przez miejscowość żłobioną głębokimi i stromymi wąwozami, w górę, na dół, znów na górę, znowuż w dół itd.

Okalanie wsi w poszukiwaniu bezpiecznego miejsca przeprawy przez rzekę na skutek konfiguracji terenu trwało długo.

Do godz. 6 wieczorem trwała ta męcząca podróż.

Wielka była nasza radość, gdy nareszcie zza drzew usłyszeliśmy szum wody, nie widząc jeszcze rzeki.

Biegiem podążaliśmy ku upragnionej przeprawie. Miejsce było dobre. Woda sięgała mi zaledwie do pasa. Była to najlżejsza z naszych rzecznych przepraw. Po pięciu mi-

nutach brodu byliśmy już na przeciwległym brzegu. Przewidująco rozejrzeliśmy się dokoła, skoczyliśmy w krzaki i prędko ubraliśmy się.

Wlazłszy na dość wysokie przybrzeżne urwisko, ruszyliśmy błotnistą łąką, która szerokim pasem ciągnęła się między rzeką a górami na zachodzie.

Ponieważ zbliżał się wieczór, a wieś już pozostała stosunkowo daleko, szliśmy dość śmiało.

Szliśmy tak do pierwszego lasku i wąwozu.

Wkroczyliśmy do lasu i zbliżywszy się do skraju wąwozu, raptem usłyszeliśmy gwizd oraz głosy męski i kobiecy.

Zamarliśmy bez ruchu i głosu. Co by to mogło być? Skąd i co robią ci ludzie tutaj o tak spóźnionej porze? Na odpowiedź czekaliśmy niedługo. Przeciągły ryk bydła sprawę wyjaśnił. Było to pastwisko dla krów.

Kurier Wileński" nr 148, 31.05.1938 r., s. 5

Zupełnie inaczej zachowuje się żubr, gdy jest w swym stroju „paradnym". „Szuka wówczas – pisze poeta – miejsc otwartych; chętnie wychodzi na polanki; gotów nawet poza obrąb puszczy emigrować i błądzić po sąsiednich lasach, gajach, łąkach... Nie unika też w owej porze człowieka. Możnaby nawet sądzić, że spotkania z nim pożąda. Prawie umyślnie idzie naprzeciw niego – pozwala mu zbliżać się na dwadzieścia, piętnaście, niekiedy na dziesięć nawet, kroków. Zbliżającemu się nie ustępuje. Ledwie go zoczył, staje jak wryty; zwykłą sobie, posągową, przybiera nieruchomość. Piękny, dumny, wspaniały i pewny siebie, każe się człowiekowi – podziwiać".

Wyraźnie bawi Gomulickiego rozbieżność w określeniu barwy żubra przez osoby, które widziały go tylko przelotem. Twierdzi on: „Jedni będą was zapewniali, że żubr jest rudy, prawie czerwony. Inni powiedzą, że ma barwę habita bernardyńskiego. Inni jeszcze nazwą go zupełnie czarnym". A następnie wyjaśnia: „Szerść żubra jest naprawdę brunatna; wydawać się wszakże może i rudą, i brudnożółtą, i czarną. Zależy to najpierw: od oświetlenia, powtóre: od pory roku; potrzecie: od wieku zwierzęcia. W ogóle, barwa żubra z latami stopniowo ciemnieje – wszakże i w ciągu jednego roku ulegać może przemianom. Cielę (które rodzi się zawsze w maju) zaraz po przyjściu na świat jest szaro-czerwonawe, niemal rude. Na jesieni, nabiera barwy brunatnej. Ta barwa szybko ciemnieje i już podczas zimy staje się tak ciemną, że zdała, na śniegu, małe żubrządko nie różni się prawie od niedźwiadka".

Pisząc o barwie sierści żubra, Gomulicki wspomina też o innych jej właściwościach: „Ta szerść jest wełnista, miękka, uginająca się pod palcami i nadzwyczaj miła w dotknięciu. Już to samo dotknięcie poucza, że się ma do czynienia nie z drapieżnikiem, lecz ze zwierzęciem łagodnem, idylicznem".



Fot. ze zbiorów autora

Dom Świcki (Myśliwski) w Białowieży, w którym przypuszczalnie zatrzymał się W. Gomulicki

Oczywiście poeta nie przesuwał dłoni po skórze żywego żubra. Wyjaśnia swemu czytelnikowi, że sprawdził subtelność jego włosia na wypchanym starannie zwierzęciu, które zdobiło przedsionek pałacu carskiego w Białowieży. Tam również widział dziewięć medalionów żubrzych, których sierść, w szarej poświacie dnia bezsłonecznego, wydała mu się czarną.

Gomulicki ubolewa, że żubry nie miały dotąd szczęścia do rysowników. Przekonał się o tym dobitnie sam, dopóki znał je tylko z rycin. Krytycznie wypowiedział się o rysunkach zamieszczonych w książce Siegmunda von Herbersteina z 1549 roku, także o rysunkach żubra i żubrzycy „z natury", wykonanych około roku 1822 przez Jana Piwarskiego, czy też o rycinie Jakuba Sokołowskiego, która trafiła do pierwszej monografii Puszczy Białowieskiej, napisanej przez barona Juliusza Brinkena. Krytycznym uwagom poddał też szkic świetnego rytownika Dietricha-ojca, który, ulegając wpływom Sokołowskiego, „uwydatnił głównie dzikość zwierzęcia, która nie jest bynajmniej głównym rysem jego fizyczności, ani charakteru". Większość zagranicznych wizerunków żubra uznał za płody czystej fantazji.

Zdaniem Gomulickiego, wszyscy portreciści zanadto zwracali uwagę na szczegóły, tracąc przy tym całość obrazu. Żaden z nich nie podpatrzył i nie odtworzył na przykład pięknej linii grzbietu, która wyraża plastyczną odrębność tego zwierzęcia. Na wszystkich rycinach, żubr

wydaje się zwierzem ociężałym, co jest zupełnym fałszem. „Żubr, choć bardzo ciężki, nie ujawnia ani trochę ociężałości. Krok jego sprężysty, swobodny, odznacza się zarówno wdziękiem jak lekkością” – podkreśla pisarz. „Żubr stąpa tak cicho, że go o dwadzieścia kroków nie słychać”. Natomiast, gdy spłoszone stado pędzi cwałem – „wówczas ziemia dudni, a szum i huk i trzask rozchodzą się po całej puszczy”.

Gomulicki zdaje się poznał wszystkie niuanse żubrzego poruszania się: „Zwykły chód żubra jest cichy, ostrożny, lekko rozkołysany. Żubr, brodzący wśród traw gęstych, zdaje się nie stąpać, lecz płynąć. Potężne jego mięśnie, prawie zupełnie od powłoki tłuszczowej wolne, poruszają się widomie i rytmicznie. Ten ruch, jak fala na wodzie, rozchodzi się od karku po całym tułowiu. I przypomina falujący chód pięknej, harmonijnie zbudowanej (…) kobiety”.

Któregoś dnia Gomulicki dowiedział się, że za zabicie żubra grozi kara w wysokości pięciuset rubli. Opiekun zwierzył się jednocześnie, że zabicie żubra uważa za okropność. Na tak podły krok nigdy nie odważy się serce szlachetnego człowieka, nawet za najwyższe wynagrodzenie. Ale zdarzają się też i tacy, którzy podjęliby się tej zbrodni.

Poeta zastanawia się: „Jak można zabijać żubra? Jak można, dla igraszki lub zysku, pozbawiać życia stworzenie boskie, piękne, szlachetne, mądre, rzadkie? Zabić żubra to tyleż prawie, co zabić człowieka. Któż z nas zresztą zna i ocenić potrafi duszę tego milczącego olbrzyma? A może ona więcej warta od niejednej duszy, tylko de nomine ludzkiej?”.

Przychodzi mu na myśl wystawiony w Białowieży obelisk, upamiętniający polowanie króla Augusta III w 1752 roku. Trupem położono wówczas czterdzieści dwa żubry. Poeta napisze, powołując się na Brinkena: „Naganka jęła napędzać biedne, oszołomione zwierzęta. Rozpoczął się mord. Grzmiał strzał po strzale. Krew tryskała purpurową fontanną; płynęła dymiącemi strugami. Piękne, olbrzymie, milczące ciała rzucały się w drgawkach śmiertelnych... A ile razy dumne, szlachetne zwierzę z nóg się zwaliło, konni dojeżdżacze uderzeli w trąby – zwycięska fanfara ulatywała ku niebu. Oszczepnicy dobijali konające zwierzęta. Polanka zmieniła się w krwawe jezioro…”.

Szkic o żubrach Wiktora Gomulickiego urzeka poetyckim opisem białowieskiej przyrody. Jest piękny, mądry, na wskroś przepojony troską o los zwierzęcego króla puszczy. Należy tylko żałować, że nie wywołał on większego zainteresowania u czytelników z początku XX wieku, a po upływie ponad stu lat stał się utworem całkowicie zapomnianym.

Piotr Bajko

Успаміны з 1995 г.

***2.* Польшча.** Эканамічная сітуацыя ў Польшчы ў 1995 г. не была добрая. У другой палове 1995 г. інфляцыя панізілася з 32,2 % у снежні 1994 г. да 27,8% у снежні 1995 г. Беспрацоўе панізілася з 15,2% у чэрвені толькі да 14,7 у снежні 1995 г., каб у студзені 1996 г. падняцца да 15,4%. А натуральны прырост пад канец 1995 г. панізіўся да 1,2 праміля.

Неразумным была лікідацыя ўладай усіх Дзяржаўных зямельных гаспадарак (PGR) рэнтабельных і нерэнтабельных. У 1989 годзе яны працавалі на 17,8 % агульнай ворнай плошчы зямлі ў сельскай гаспадарцы і год закончылі з прыбыткам. У 1990 г. працавала ў іх 325 тыс. працаўнікоў і год закончылі з прыбыткам 6 більёнаў старых польскіх злотых. (У 1980 г. – працавала ў іх нават 490,3 тыс. асоб). І толькі, калі працаўнікі гаспадарак пачулі, што чакае іх ліквідацыя і 19 кастрычніка 1991 г. быў уведзены закон аб ліквідацыі ўсіх Дзяржаўных зямельных гаспадарак, а іх маёнтак меў быць перададзены Агенцтву зямельнай уласнасці Дзяржаўнага казначэйства, яны панеслі страты 6.7 більёнаў старых злотых. Аднак і тады 368 гаспадарак выпрацавалі прыбытак. Тады працавала ў Дзяржаўных зямельных гаспадарках 193 тысяч працаўнікоў. Агенства Зямельнай уласнасці Дзяржаўнага казначэйства забрала ўсе 1666 Дзяржаўных зямельных гаспадарак. Працэс іх ліквідацыі закончыўся ў 1995 годзе. Апошняй ліквідаванай 30 лістапада 1995 г. Дзяржаўнай зямельнай гаспадаркай быў „Торфроль” у Познані. Ліквідацыя тых гаспадарак прывяла да абмежавання ці нават да спынення гадоўлі жывёлы, абмежавання расліннай прадукцыі ў дзяржаве. Многа людзей страціла працу і не маглі яе там дзе працавалі знайсці. У 1991 годзе колькасць беспрацоўных, якія падавалі астатняе месца працы як Дзяржаўная зямельная гаспадарка было 100 тысяч. Пасля рэструктурызацыі, калі нават знайшлі працу, то новыя ўласнікі агранічвалі працаўнікам сацыяльныя прывілеі, ліквідавалі чыгуначныя лініі, школы, аўтобусныя лініі, што павялічвала беспрацоўе. Пры ліквідацыі многа маёмасці раскралі і знішчылі, многія будынкі спустошылі. Гэта было одной з прычын незадаволеннасці з новай ўлады і прывяло да таго, што ў выбарах людзі галасавалі на прадстаўнікоў Сацыял-дэмакратычнай партыі і яны дайшлі да ўлады. Многія думалі, што яны зліквідуюць беспрацоўе і палепшаць іх жыццё.

Беспрацоўе родзіць злачыннасць, як ашуканства, крадзеж, напады, банды і алкагалізм, самагубствы, меншы натуральны прырост у дзяржаве і інншыя адмоўныя з’явы, якія пужалі людзей. Ды тыя, якія мелі ўладу, не

турбаваліся тым, між імі цвіла карупцыя, многія з іх імкнуліся да лёгкай нажывы. Хутка паявіліся багацеі і армія бяздомных. Штодзень бачыў, як стаялі доўгія чэргі бяздомных за апалонікам дармовага супу ля Цэнтральнага чыгуначнага вакзала ў Варшаве. Газеты пісалі, што ў мароз многа бяздомных замярзала ў старых неабаграваных дамах у Варшаве і ішых гарадах, а хітрэйшыя бяздомныя ішлі спаць у цеплавыя тунэлі, дзе праходзілі трубы з цеплацэнтралі з гарачай вадой для абаграванння дамоў.

У сувязі з тым, што „Энергапрект" ліквідаваў свой Дом адпачынку ў Свінавусці, я выкупіў ў гарадскім бюро на Пляцу МДМ у Варшаве 4 месцы ў доме адпачынку ў Крыніцы-Морской ля Балтыйскага мора ад 5 да 18 ліпеня для мяне і дачкі з двума сынамі. Мая жонка не захацела ехаць з намі. Дачка з сынамі прыехала да мяне 4 ліпеня, яны пераначавалі ў маёй кватэры і ранкам мы разам паехалі хуткім цягнікам у Гданьск-Вжэшч, а потым аўтобусам у Крыніцу-Морскую і там у Доме адпачынку атрымалі два пакоі. У адным я спаў са старэйшым унукам, а у другім мая дачка Ірэна са сваім малодшым сынам. Дом адпачынку быў побач касцёла, у якім у нядзелю будзілі нас званы, і блізка парку, і метраў 50 ад марскога пляжа. Пляж быў пяшчаны. Гарадок Крыніца-Морская быў невялікі, тады належаў да Эльблонгскага ваяводства. Знаходзіцца ён 25 км на ўсход ад Гданьска на Віслянай касе, якая ляжыць паміж Гданьскай бухтай і Вісляным залівам. Пагода была сонечная, так што час нам там прайшоў вельмі хутка.

Недалёка ад Крыніцы-Морскай ляжаў былы нямецкі канцэнтрацыйны лагер Штутгоф, які немцы пабудавалі ў верасні 1939 г. і ў якім замучылі да мая 1945 г. больш чым 200 тысяч людзей з Еўропы. Многа людзей там згінула. Папала туды многа жыхароў з Варшавы пасля Варшаўскага паўстання 1944 г. 25 красавіка 1945 г. немцы стараліся вывезці вязняў на захад пры дапамозе караблёў і многа іх патанула ў моры. 12 сакавіка 1962 г. паўстаў там Музей Штутгоф у Штутаве, які мы пабачылі. Са старых аб'ектаў лагера стаялі тады там 4 баракі, будынак нямецкай камендатуры, крэматорый, газавая камера, дзе немцы газам атручвалі людзей, і агароджа старага лагера. 500 м. ад лагера на месцы, дзе немцы палілі целы памерлых і атручаных вязняў, стаіць Помнік Памяці Ахвяр.

18 ліпеня позна вечарам вярнуліся мы цягнікам з Гданьска ў Варшаву, дачка з сынамі пераначавала у мяне на кватэры і 19 ліпеня яны вярнуліся у Беласток.

15-16 ліпеня, калі мы былі ў Крыніцы-Морскай, ля возера Жарнавецкага ў Чыманаве прайшоў першы „Прыпынак Вудсток", які склікаў Ежы Аўсяк.

31 жніўня ліквідавалі апошнюю тралейбусную лінію ў Варшаве, якая праходзіла побач дома, дзе я жыву. Замянілі тралейбусы аўтобусамі, якія забруджваюць паветра.

11 верасня ў вугальнай шахце „Польшча Вірэк" у Рудзе Слёнскай ад асядання вугля згінула 5 шахцёраў, а чатырох жывымі выцягнулі з шахты пасля 5-ці сутак.

1 кастрычніка распачаўся ў Варшаве XIII Міжнародны Конкурс Піяністаў ім. Фрыдэрыка Шапена, закончыўся ён 22 кастрычніка. 1-шай узнагароды нікому не прызналі. 2-ую ўзнагароду далі французскаму піяністу Філіпу Гюсяну і рускаму піяністу Аляксею Султанаву, які не захацеў яе прыняць.

5 лістапада прайшоў першы тур выбараў прэзідэнта Польшчы, у якім бралі ўдзел 17 асоб. Найбольш галасоў атрымалі Аляксандар Квасьнеўскі (35,11 %) і Лех Валэнса (33,11%). Бралі ўдзел у галасаванні 64,7% выбаршчыкаў. Ніхто з іншых кандыдатаў не атрымаў нават 10% галасоў. Найбольш галасоў з іншых атрымаў Яцэк Курань. Трох кандыдатаў не атрымалі нават 0,2% галасоў. Кандыдатамі былі: Ян Альшэўскі, Вальдэмар Паўляк, Тадэвуш Зялінскі, Лех Качыньскі, Лешак Мачульскі, Ганна Гранкевіч-Вальц, артыст кабарэ Ян Петшак і іншыя. Да другага туру ўвайшлі Аляксандар Квасьнеўскі і Лех Валэнса.

19 лістапада прайшоў другі тур выбароў прэзідэнта Польшчы, у якім Аляксандр Квасьнеўскі атрымаў 51,72%, а Лех Валэнса 48,28% галасоў пры галасуючых 68,23% выбаршчыкаў. Вынікі выбараў паказалі, што ёсць тры групы грамадзян у Польшчы. Самая вялікая група незадаволеных з новай улады, якая выбрала на прэзідэнта А. Квасьнеўскага. Другая група гэта староннікі „Салідарнасці", якія задаволены новай уладай і прэзідэнтам Л. Валэнсам і трэцяя група, якая маўчыць. Яна не галасавала, бо ёй не залежала, хто будзе прэзідэнтам дзяржавы, або не верыла, што нейкі з кандыдатаў палепшыць эканамічную сітуацыю ў дзяржаве. У сувязі з тым, што розніца між галасуючымі на Квасьнеўскага і на Валэнсу была невялікая, пачаліся пратэсты дугой групы і абвінавачванне ў фальсіфікацыі выбараў. Вельмі пратэставалі староннікі Радыё „Марыя". Новым прэзідэнтам Польшчы стаў Аляксандр Квасьнеўскі.

1 снежня адыходзячы прэзідэнт Лех Валэнса ўзнагародзіў Уладыслава Барташэўскага ордэнам Белага Арла.

21 снежня міністр унутраных спраў Анджэй Мільчаноўскі паінфармаваў у Сейме, што з дакументаў атрыманых з Ведамства аховы дзяржавы вынікае, што Юзэф Алексы, які быў прэм'ер-міністрам Польскага ўрада, з'яўляецца супрацоўнікам расійскіх Спецыяльных служб пад псеўданімам „Олін". Раней А. Мільчаноўскі на сустрэчы з прэзідэнтам Л. Валэнсам, а потым у Сейме абвінаваціў Юзэфа Алексага ў шпіёнскай дзейнасці для РФ. Быццам бы ён некалькі год быў шпіёнам перадаваў весткі рускаму рэзідэнту КДБ Алганаву, а пасля Якімішыну. Прэм'ер- міністр Ю. Алексы месяц пасля абвінавачання яго ў шпіянажы падаўся ў адстаўку з пасады прэм'ер-міністра і быў пасля выбраны шэфам

Сацыял-дэмакратычнай партыі і ў сакввіку 1996 г. ваенны пракурор ануляваў яму абвінавачанне ў шпіянажы. Пасля смерці Юзафа Алексага ў 2015 г. Лех Валэнса сказаў, што ён не верыў Мільчаноўскаму, што Ю. Алексы быў шпіёнам, аднак тады не выступіў супраць яго абвінавачання.

22 снежня Лех Валэнса перастаў быць прэзідэнтам Польшчы і замяніў яго 23 снежня, прыняўшы прысягу, Аляксандр Квасьнеўскі.

23 снежня школьны карабель Ваеннага Флота „Іскра" пасля 158 дзён плавання акружыў зямны шар, пераплыўшы 706 марскіх міль.

Беларусь

У Беларусі пасля рэферэндума 14 мая хутка ўсюды змянілі дзяржаўныя сцягі і дзяржаўныя сімвалы, а руская мова стала важнейшайшай ад беларускай і прэзідэнт А. Лукашэнка ўзмоцніў эканамічныя сувязі з Расіяй, ад якой атрымаў хутка дапамогу: танны газ і нафту, і рускі выгадны рынак на беларускія тавары.Тады ў Беларусі было 10 мільёнаў і 177 тыс. жыхароў і між імі здольных да працы 5 мільёнаў і 672 тыс асоб, у эканоміцы працавала 4 міл. і 410 тыс. жыхароў. Прадукавала тады Беларусь менш тавараў, чым у савецкі перыяд у 1989 годзе. Напр. у 1989 г. Беларусь выпрадукавала 38.2 мільярдаў ватгадзінаў электраэнергіі, а ў 1995 годзе толькі 24,9 мільярдаў ватгадзінаў. Нават у 2013 годзе выпрадукавала Беларусь толькі 31,5 мільярдаў ватгадзінаў. Трактароў Беларусть у 1989г. выпусціла 106,7 тыс. шт., а ў 1995 г. 28 тыс. шт., грузавікоў у 1989 г. у Беларусі выйшла з фабрык 42,1 тыс. шт., а ў 1995 – 12,9 тыс. шт. Мінеральных угнаенняў у 1989 г. выпусцілі 6700 тысяч тон, а ў 1995г. – 3348 тыс. Тон. Толькі з расійскай нафты Беларусь выпрадукавала ў 1995 г. 131118 тыс. тон розных прадуктаў, якія высылала і прадавала заходнім дзяржавам.

Беларусь у 1989 годзе была ў лепшай эканамічнай сітуацыі, чым Польшча, мела меншую інфляцыю і не мела замежных даўгоў. У 1990 г. на Беларусі было два разы больш урачоў і два разы больш ложкаў у шпіталях, пералічваючы на жыхараў, чым у Польшчы. Каэфіцыент смяротнасці нованароджаных дзяцей на 1000 народжаных быў на Беларусі 25% ніжэйшы чым у Польшчы. У сувязі з тым, што на Беларусі не ўвялі гаспадарчых рэформ і тыя, якія пачалі ўводзіць, А. Лукашэнка затрымаў, то не бачачы на вялікую дапамогу Расіі, у 1995 г. эканамічная сітуацыя ў Польшчы была многа лепшая, чым у Беларусі. У Польшчы іфляцыя была многа меншая і была праведзена дэнамінацыя валюты, якой на Беларусі да сённяшняга дня не ўвялі. Толькі беспрацоўе на Беларусі было меншае чым у Польшчы, бо зарэгістравананае беспрацоўе ў 1994 г было 2,1 %, ў 1998 г – 2,3 %, а сапраўднае напэўна не было большым чым 6%.

12 верасня ў Брэсцкай вобласці выстраламі з верталёта Супрацьпаветранай аховы збілі паветраны шар, у якім ляцелі два амерыканскія спартоўцы, удзельнікі Міжнароднага чэмпіяната па паветранаму лятанні. Беларускія ўлады пасля апраўдваліся, што іх ніхто не паведаміў аб палёце шара.

29 лістапала прайшоў першы тур паўторных выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Савета.

10 снежня прайшоў другі тур паўторных выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Савета. Для правамоцнасці новага складу Вярхоўнага Савета трэба было выбраць не менш чым 198 дэпутатаў і столькі выбралі. Болшасць месцаў у парламенце атрымалі камуністы і аграрнікі – 78 месцаў з 360, не лічачы беспартыйных. Старшынёй Вярхоўнага Савета выбралі аграрніка Сямёна Шарэцкага.

Расія

6 ліпеня ў Расіі ўвялі „валютны калідор". „Валютны калідор" – гэта межы хістання валютнага курса, устанаўліваемыя як спосаб яго дзяржаўнага рэгулявання і падтрымлівання Цэнтральным банкам пры дапамозе пакупкі і продажу валюты. Дзяржава ўзяла на сябе абавязак утрымаць курс рубля да долара ў раней аб'яўленых межах. Спекулянты, іграючы на хістаннях валютных курсаў, выцягвалі з дзяржавы астатнія рублі. Каб затармазіць хістанні валютнага рынка, стабілізаваць сітуацыю, Цэнтральны банк увёў „валютны калідор". „Валютны калідор" аб'явілі спачатку на квартал, потым на паўгода, а пасля на год. «Валютны калідор" уводзіцца, калі дзяржава не мае свабоднага капіталу ці мае вялікія замежныя і ўнутраныя даўгі.

9 ліпеня двух псіхічна хворых жыхароў Якуціі захапілі самалёт Іл-62 з 174 пасажырамі. Самалёт прызямліўся ў Нарыльску і быў узяты штурмам, тэрарыстаў арыштавалі і скіравалі іх у псіхічную бальніцу лячыцца.

30 ліпеня прадстаўнікі Чачні і Расіі падпісалі ў Грозным мірны дагавор.

3 жніўня расійскі самалёт Іл-76, які вёз амуніцыю цэнтралнай уладзе ў Кабуле быў змушаны прызямліцца ў Кандагары, дзе захапілі яго афганскія талібы.

24 жніўня заваліўся рынак міжбанкаўскіх крэдытаў і 28% расійскіх банкаў закончылі сваю працу.

3 верасня выляцеў у космас расійскі касмічны карабель ТМ-22 з касманаўтамі Юрыем Гідзенкам, Сяргеем Аўдзеевым і немцам Томасам Райтэрам. Карабель прыстыкаваўся да касмічнай станцыі „Мір" і вярнуўся на зямлю з трыма вышэйназванымі касманаўтамі 29 лютага 1996 г.

11 верасня прызямліўся касмічны карабель Саюз ТМ-21 з касманаўтамі Анатоліем Салаўёвым і Мікалаем Бударыным.

13 верасня невядомая асоба абстраляла ў Маскве з гранатомёта РПГ-26 пасольства ЗША. Ніхто не згінуў і не быў паранены, толькі будынак быў пашкоджаны.

Праўдападобна абстраляў пасольства крымінальнік Уладзімір Татарэнкаў пратэстуючы супраць аперацыі „Абдуманая сіла”, за абстрэл самалётамі НАТА пазіцый баснійскіх сербаў.

24 верасня на мысе Стэрлінгава разбіўся верталёт Мі-8. Згінула 15 асоб.

14 кастрычніка тэрарыст Сургай захапіў аўтобус з 26 паўднёвакарэйскімі турыстамі ў Маскве на Васільеўскім спуску і патрабаваў 1 мільён долараў і грозіў узарваць аўтобус, калі не атрымае валюты. Падчас штурму тэрарыст быў забіты, а турысты не пацярпелі.

26 кастрычніка катастрофа самалёта Ан-32 на аэрадроме «Максімаўка» ў горадзе Уфа. Самалёт упаў і загарэўся. 7 асоб згінула, а 6 папала ў бальнніцу.

8 лістапада на сустрэчы міністраў абароны Расіі і ЗША ў Бруселе дайшло да згоды, што расійскае войска будзе браць удзел у многанацыянальных сілах у Босніі і Герцагавіне.

17 лістапада прайшоў першы закладны аўкцыён па 7 буйных прадпрыемстваў (Нарыльскі нікель, Заходня-Сібірскі металургічны камбінат, Паўночна-заходняе параходства і іншыя). Каб памагчы дзяржаве перамагчы бюджэтны дэфіцыт, яшчэ ў сакавіку буйныя банкіры запрапанавалі крэдытаваць уладу пад залог дзяржаўных пакетаў акцый найбольш цікавых прадпрыемстваў. Урад згадзіўся. Канструкцыя залогавых аукцыёнаў была тэхналагічна ўпісана ў палітычны графік. Банкіры пад залог актываў прадпрыемстваў да выбараў прэзідэнта ў 1996 годзе далі дзяржаве крэдыт, далі грошы патрэбныя дзяржаве, каб выплаціць бюджэтнікам плацы і пенсіі пенсіянерам. Калі пасля заканчэння дамоўленага тэрміну дзяржава не будзе ў змозе вярнуць аўкцыёнерам пазычаных грошай, то дзяржаўныя прадпрыемствы стануць іх уласнасцю. Калі тэрмін прыйшоў пасля выбараў прэзідэнта было відна, што дзяржава не верне банкірам крэдыту. А палітыка прэзідэнта Б. Ельцына была такая: крэдыту ім не вернем і хай бяруць на ўласнасць дзяржаўныя прадпрыемствы. Так прыватызаваліся ўладай дзяржаўныя прадпрыемста. Так паўсталі ў Расіі алігархі.

6 снежня ў катастрофе самалёта Ту-134 пад Хабараўскам згінула 98 асоб.

10 снежня ў Чачні баевікі Саламана Радуева захапілі Гудэрмес, ды пры дапамозе авіацыі расіяне да 23 снежня выгналі іх з горада.

12 снежня пілатажная група „Рускія вітязі” ў складзе аднаго транспартнага самалёта Іл-76 і пяці СУ-27 пацярпелі катастрофу пры пасадцы ў в’етнамскім горадзе Камрань.

14 снежня чачэнскія баевікі Руслана Галаева захапілі Урус-Мартан і Ахой-Мартан. Аднак 20 снежня іх адтуль расіяне з чачэнскай міліцыяй выгналі. У аперацыі супраць Руслана Галаева брала ўдзел першы раз прарасійская чачэнская міліцыя.

14-17 снежня ў Чачні прайшлі выбары. Перад выбарамі сепаратысты заявілі, што не прызнаюць выбараў. У выбарах перамог Доку Заўгаеў, які атрымаў 90% галасоў выбаршчыкаў.

17 снежня прайшлі выбары ў Дзяржаўную Думу. Выбіралі па змешанай сістэме: палова дэпутацкіх мандатаў размеркавалася між партыямі, федэральныя спісы, якіх атрымалі болш чым 5% галасоў кожны, другая палова дэпутатаў выбіралася па мажарытарных акругах. У выбарах брала ўдзел 43 партыі. 5-працэнтны бар’ер перамаглі толькі 4 партыі: найбольш галасоў атрымала Камуністычная партыя Генадзія Зюганава (22,3% і 175 мандатаў), ЛДПР Жырыноўскага (11,2% і 51мандатаў), „Наш дом – Расія” (10,1% і 55 мандатаў) і „Яблако” (6,9% і 4 мандатаў).

Іншыя дзяржавы

6-13 ліпеня войска Рэспублікі Сербскай у Босніі захапіла Срэбраніцу. Пачынаецца этнічная чыстка мусульман у Срэбраніцы. Многа мусульман было забітых.

10 ліпеня ў Бірме (сёння называецца М’янма) была вызвалена з дамашняга арышту (арыштаваная ў ліпені 1989 г.) лідар апазіцыі Аун Сан Су Джы. 10 кастрычніка аднавілі ёй пасаду генеральнага сакратара Нацыянальнай лігі за дэмакратыю.

10 ліпеня папа рымскі Ян Павеп ІІ ў спецыяльным пасланні жанчынам прызнаў, што каталіцкі касцёл на працягу многіх год іх дыскрымінаваў.

11 ліпеня ЗША і В’етнам аднавілі поўныя дыпламатычныя адносіны.

13 ліпеня наступіў 70-ты старт (STS-70) па праграме Спейс шатл і 21 палёт шатла „Дыскаверы” з касманаўтамі Тэрэнсам Хенрыксам, Кевінам Крэгелям, Ненсі Кур’е, Дональдам Томасам і Мэры Узбер. Вывязлі яны на арбіту ў космас тэлескоп. Вярнуліся на зямлю 22 ліпеня.

14 ліпеня баснійскія сербы пачалі атакі на зону бяспечнасці ў Зепе на ўсходзе Босніі і Герцагавіны і захапілі горад 25 ліпеня.

18 ліпеня пачаліся ў Кіеве хваляванні пры пахаванні патрыярха Украінскай Праваслаўнай Царквы Кіеўскага Патрыярхата Уладзіміра (Раманюка), якога хацелі пахаваць у Сафійскім саборы. Не згадзілася на гэта Праваслаўная Царква Маскоўскага Патрыярхата. Пахавалі яго побач Сафійскага манастыра.

20 ліпеня баснійскія сербы і іх саюзнікі пачалі наступаць на зону бяспечнасці ў Біхачы на паўночным захадзе Босніі і Герцагавіны. 27 ліпеня Харватыя ўвяла свае войска ў Боснію і Герцагавіну, каб адцягнуць сербскае войска ад Біхача.

21 ліпеня Кітай праводзіць да 26 ліпеня ракетныя выпрабаванні блізка Тайваня.

24 ліпеня Міжнародны Крымінальны Трыбунал для былой Югаславіі абвінаваціў правадыроў баснійскіх

сербаў Радавана Караджыча і Ратка Младзіча ў генацыдзе, у злачынстве супраць чалавецтва і ў ваенным злачынстве.

25 ліпеня наступіў тэрарыстычны акт у Парыжскім метро. На станцыі Сен-Мішэль наступіў выбух газавага балона. Згінула 8 асоб, а 117 асоб было параненых.

25-30 ліпеня ў аперацыі „Лета 95" пачаўся наступ харвацкіх і баснійскіх вайсковых сіл супраць войска Сербскай Рэспублікі ў Босніі і Герцагавіне.

26 ліпеня прадстаўнікі 15 дзяржаў Еўрасаюза падпісалі Канвенцыю стварэння Еўрапола – арганізацыі, якая мае каардынаваць дзейнасць паліцыі дзяржаў Еўрасаюза па барацьбе са злачыннасцю.

28 ліпеня змянілі ў Індыі назву горада Бамбей на Мумбаі.

30 ліпеня прадстаўнікі Чачні і Расіі падпісалі ў Грозным мірнае пагадненне.

4-9 жніўня ў аперацыі „Бура" Армія Харватыі і афіцыйна прызнаныя баснійскія ўлады ліквідуюць Рэспубліку Сербская Краіна і Рэспубліку Заходняя Боснія. Выганяюць адтуль 250 тысяч сербаў. Харватыя стала маналітнай дзяржавай. 5 жніўня харваты захапілі горад Кнін. Дзень захопу Кніна святкуюць у Харватыі як Дзень перамогі.

8 жніўня ў горадзе Двор на Уне харвацкая авіяцыя бамбіла і забіла злачынна многа безабаронных сербаў, выгнаных з Краіны, якія ўцякалі на ўсход у Югаславію.

9 жніўня ў катастрофе самалёта Боінга 736 у Сальвадары згінула 65 асоб.

17 жніўня ў Парыжы ля Трыумфальнай аркі ад выбуху падложэнага тэрарыстам газавага балона было параненых 17 асоб.

20 жніўня ў індыйскім горадзе Феразабад сутыкнуліся два цягнікі. Згінула 305 пасажыраў, а 344 было параненых.

28 жніўня ў Сараеве ад выбуху снарада (выстрэленага сербамі) на рынку Маркале згінула 35 асоб, а 85 было параненых.

30 жніўня пасля адмовы баснійскіх сербаў забраць цяжкае ўзбраенне з-пад Сараева войска НАТА і ААН пачалі ваенную аперацыю „Абдуманая сіла" супраць Рэспублікі Сербскай, бамбілі сербаў да 14 верасня.

30 жніўня у Грузіі ў Тбілісі быў замах на Эдуарда Шэварнадзе: ля парламенцкага гаража выбухла машына „Ніва". Шэварнадзе быў лёгка паранены.

3 верасня ў Парыжы на бульвары Рэшар-Ленуар выбухла бомба падложаная тэрарыстам, якая раніла 4 асобы.

4 верасня ў Японіі абвінавацілі трох амерыканскіх салдат у згвалтаванні на Акінаве дванаццацігадовай дзяўчынкі. Пачаліся пратэсты і дэманстрацыі жыхароў Японіі супраць прысутнасці амерыканскіх салдат у Японіі.

5 верасня Францыя правяла выпрабавальны ядзерны выбух на атоле Муроў у паўднёвай частцы Ціхага акіяна. Пачаліся масавыя пратэсты на Таіці і ў іншых раёнах Ціхага акіяна.

7 верасня наступіў 71 старт (STS-69) па праграме Спейс шатл і 9 палёт шатла „Індэвор" з касманаўтамі Дэвідам Уокерам, Кенетам Какрэлам, Джэймсам Восам, Джэймсам Ньюманам і Майклам Гернхардам. Касманаўты вярнуліся на зямлю 15 верасня.

8 верасня ў Швейцарыі ў Жэневе прадстаўнікі Вялікабрытаніі, Германііі, Расіі, ЗША, Францыі і міністры замежных спраў Босніі і Герцагавіны, Харватыі і Югаславіі згадзіліся з асноўнымі прынцыпамі мірнага дагавору між ваюючымі ў Босніі. 26 верасня ў Нью-Йорку міністры замежных спраў дапрацавалі дакумент мірнага дагавору.

8-22 верасня баснійскае войска пачало наступ у заходняй і цэнтральнай частцы Босніі і Герцагавіны на сербаў і адабралі ў іх 20% іх тэрыторыі. Сербы сталі кантраляваць толькі 50% тэрыторыі Босніі і Герцагавіны.

9 верасня ў Калумбіі ля Макарэна разбіўся самалёт CASA 212 Aviocar 200, згінула 21 асоба.

15 верасня прэзідэнт Казахстана дае загад перанесці сталіцу дзяржавы з Алма-Аты ў паўночны горад Акмолу.

15 верасня ў Таваў ў Малайзіі разбіўся самалёт Фокер 50. Згінула 34 асобы.

21 верасня разбіўся самалёт АН-24РВ ля Мурэна ў Манголіі. Згінула 42 асобы.

22 верасня ў Акорыджу на Алясцы ў рухавік самалёта Боінга Е-3А ВВС, ЗША трапляюць птушкі. Самалёт упаў, разбіўся і загарэўся. Згінула 24 асобы.

25 верасня прэм'ер-міністр Ізраіля Іцхак Рабін і старшыня ОВП Ясір Арафат падпісалі ў Вашынгтоне згоду на паўстанне Палестынскай Аўтаноміі на Заходнім беразе ракі Іардан.

30 верасня – 1 кастрычніка ў выбарах у Латвіі найбольш мандатаў (18 у 100-мандатным парламенце) атрымала Дэмакратычная партыя „Саймніекс".

4 кастрычніка ў Барскаун ў Кіргізіі верталёт Мі-8 кампаніі Кіргізія Аба Зоольдору разбіўся ў гарах. Згінула 15 асоб.

6 кастрычніка ў Парыжскім метро ў раёне станцыі Мезон-Бланш ад выбуху тэрарыстычнай бомбы было параненых 13 асоб.

12 кастрычніка закончылася вайна ў Босніі і Герцагавіне на 160 дзён.

15 кастрычніка на выбарах прэзідэнта ў Іраку Садам Хусейн атрымаў 99,96% галасоў.

16 кастрычніка ў Вашынгтоне прайшоў „марш мільёна чалавек", арганізаваны Лоісам Фаракханам, лідарам арганізацыі „Страчаная і знойдзеная ісламская нацыя". Л. Фаракхан прызываў 837 тысяч неграў-мужчын

удзельнічаючых у маніфестацыі да маральнага і духоўнага абнаўлення і абвінавацію белых у расізме.

17 кастрычніка ад тэрарыстычнага акта у Парыжскім метро было параненых 29 асоб.

18 кастрычніка Украіна ўступіла ў Савет Еўропы.

20 кастрычніка наступіў 72 старт (STS-73) па праграме Спейс шатл і 18 палёт шатла „Калумбія” з касманаўтамі Кенетам Боуэрсаксам, Кенетам Ромінджэрам, Катэрынай Коулман, Майклам Лопез-Алегрыа, Кетрынай Торнтон, Фрэдам Леслие і Альбертам Сакам. Касманаўты вярнуліся на зямлю 5 лістапада.

23 кастрычніка ў Нью-Йорку прайшло расійска-амерыканскае спатканне прэзідэнтаў. Б. Ельцын згадзіўся, каб расійскія салдаты бралі ўдзел у аперацыях у Босніі і Герцагавіне разам з салдатамі дзяржаў НАТА.

28 кастрычніка ў пажары ў метро ў Баку згінула 300 асоб.

1 лістапада ў авіябазе Райт-Патэрсон у Дайтоне ў штаце Огайа, ЗША пачаліся мірныя перагаворы паміж прадстаўнікамі ваюючых ў Босніі і Герцагавіне. Дэлегацыі ўзначальвалі Алія Ізбеговіч – прэзідэнт Босніі, Франьо Туджман – Харватыі і Слабодан Мілашэвіч – прэзідэнт Югаславіі. С. Мілашэвіч прадстаўляў таксама баснійскіх сербаў.

4 лістапада ў Тэль-Авіве быў забіты прэм’ер-міністр Ізраіля Іцхак Рабін. Забіў яго габрэй, студэнт Юрыдычнага факультэта Ігаль Амір, за згоду прэм’ера вярнуць зямлю палестынцам.

7 лістапада прайшлі прэзідэнцкія і парламенцкія выбары ў Грузіі. Прэзідэнтам стаў Эдуард Шэварнадзе, а ў парламенцкіх выбарах большасць мандатаў атрымала партыя Э. Шэварнадзе „Саюз Грамадзян Грузіі”

9 лістапада ў Аргенціне ля горада Луяба разбіўся самалёт Fokker F-27 Friendship кампаніі Lineas Aereas del Estado. Згінула 53 асобы.

12 лістапада наступіў 73 старт (STS-74) па праграме Спейс Шатл і 15 палёт шатла „Атлантыс” з касманаўтамі Кенетам Камеронам, Джэймсам Холселам, Крысам Хелфілдам, Джэрым Росам і Уільямам Макартурам. „Атлантыс” 15 лістапада прыстыкаваўся да расійскай касмічнай станцыі „Мір” і 18 лістапада адстыкаваўся, а вярнуўся на зямлю 20 лістапада.

12 лістапада сербскія лідэры згадзіліся аддаць Харватыі Усходнюю Славенію.

12 лістапала ў Табакасаўхозе Крымскага раёна казакі Новаўкраінскага курэня і баркашоўцы пад кіраўніцтвам атамана курэня Барыса Ястрэба, зрабілі пагром туркаў месхетынцаў. Адна жанчына масхетынка памерла ад ран.

13 лістапада ад выбуху двух грузавікоў на стаянцы аўтамабіляў паблізу цэнтра падрыхтоўкі амерыканскімі спецыялістамі саўдыйскай народнай гвардыі ў Рыядзе згінула 7 асоб, між імі 5 амерыканцаў, а 60 асоб было параненых.

2 снежня на арбіту вакол зямлі выпусцілі амерыканска-еўрапейскі зонд СОГО.

3 снежня ў катастрофе камерунскага самалёта Боінга737 у Камеруне згінулі 72 асобы.

5 снежня ў катастрофе азербейджанскага самалёта Ту-134В ля Нахічавана згінула 54 асобы.

7 снежня зонд Галілеа даляцеў да планеты Юпітэр.

14 снежня себскі прэзідэнт Слабодан Мілошавіч, баснійскі прэзідэнт Алія Ізетбегавіч і прэзідэнт Харватыі Франьо Туджман падпісалі ў Парыжы Дэйтонскае пагадненне, якое закончыла вайну ў Босніі і Герцэгавіне.

18 снежня ў катастрофе самалета Lockheed L-188C у Анголе згінула 141 асоба.

20 снежня ў катастрофе амерыканскага самалёта Боінга 757 у гарах у Калумбіі згінула 160 асоб.

24 снежня была прынята канстытуцыя ў рэферэндуме ў Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспубліцы.

Дзмітры Шатыловіч

Працяг будзе

Фэст беларускай вышыванкі

На Русінаўскай сядзібе Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны (Баранавіцкі раён) 6 чэрвеня адбыўся фэст «Баранавіцкая вышыванка», у якім прынялі ўдзел аматары нацыянальных строяў. Напрыклад, грамадскі актывіст Рыгор Грык прыйшоў на фэст у кашулі, якую шмат гадоў таму пашыла ягоная маці. Ларысе Гоўшы таксама вышыванку падарыла мама, а Вячаславу Болбату – жонка. Апрануў сына Мікалая і ўнукаў Паўла і Андрэя ў зробленыя сваімі рукамі кашулі і мясцовы прадпрымальнік Мікалай Чарнавус. Адзін з арганізатараў курсаў „Мовананова” Алесь Гізун прывёз прыгожую вышыванку з суседняй Украіны. Цудоўны ўбор для сябе падчас фэсту беларускай вышыванкі прадэманстравала Анжэла Камбалава. Грамадская актывістка Таццяна Малашчанка зрабіла вышыванкі для сваёй сям’і сама. А майстрыца Галіна Ярашэвіч пашыла асабістыя каляровыя вышыванкі для актыві-

Я апрану вышыванку,
Сустрэну хлопца на ганку,
І будзем мы каля рэчкі,
Гуляць да самага ранку.

Кашуля-вышыванка,
гарыць на мне бы маланка,
Ляжыць за крыжыкам крыжык,
Нідзе не дзенецца Янка.

Галіна Ярашэвіч



Фота ТБМ у Баранавічах

З уступным словам выступае Віктар Сырыца, старшыня Баранавіцкай рады ТБМ

стаў ТБМ Віктара Сырыцы і Сяргея Гоўшы.

Усяго сабралася каля ста чалавек, трыццаць з якіх былі ў вышыванках. І няхай не ва ўсіх былі адмысловыя ўборы, вышытыя па палатне (некаторыя былі ў кашулях з намаляваным беларускім арнаментам), але было прыемна назіраць, як людзі ганарацца тым, што яны апрануліся ў каляровыя кашулі з беларускім арнаментам, і як па-добраму зайздросцяць ім тыя, у каго на гэты раз прыйсці ў вышыванцы пакуль не атрымалася.

Напачатку ўдзельнікі і госці святочнай імпрэзы прагледзелі фільмы прысвечаныя вышыванкам, якія нядаўна транслявалі па Белсаце. І ў фільмах, і ў выступах акцэнт рабіўся на тое, што вышыванка – гэта не проста прыгожая кашуля, гэтак чалавек абазначаў раней і цяпер сваю прыналежнасць да беларускай супольнасці. Старшыня Баранавіцкай Рады ТБМ прадэманстраваў старыя фотаздымкі беларусаў у нацыянальных строях, распавёў пра гісторыю вышыўкі і паказаў адзенне аматараў вышыванкі розных часоў. Было адзначана, што ў вышыванцы хадзіла Элаіза Пашкевіч, нацыянальнай кашулі не цураліся Янка Купала, Якуб Колас, Уладзіслаў Галубок, у вышыванках былі пахаваныя Рыгор Барадулін і Генадзь Бураўкін.

З дакладам пра сымбалі на вышыванках выступіў Уладзімір Гундар, які адзначыў, што вышыванка – гэта ў нейкай ступені абярэг, у ёй чалавек адчувае сябе абароненым. Спадар Уладзімір падсумаваў, што беларуская вышыванка і наша мова – гэта наша адметнасць, гэта тое, што вызначае нас сярод іншых народаў.

Сябра Баранавіцкай Рады ТБМ Галіна Ярашэвіч расказала ўдзельнікам імпрэзы пра выставу вышыванкі, асаблівасці святочнага жаночага і мужчынскага адзення. На святочнай імпрэзе яна прадставіла шмат іншых вырабаў з вышыўкай: ручнікі, карціны, сурвэткі. А жыхарка вёскі Падлессе Ганна Ганча-



Фота ТБМ у Баранавічах

Павал і Андрэй Чарнавусы


Фота ТБМ у Баранавічах


Галіна Ярашэвіч

рык прадэманстравала вышытыя сваімі рукамі ўзоры і распавяла пра адметнасць беларускай вышыўкі Ляхавіцкага рэгіёна.

Сябра Цэнтральнай Рады ТБМ Анжэла Камбалава арганізавала для прысутных дзяцей мастацкі плэнэр, падчас якога маладзёны малявалі каляровыя вышыванкі. Пераможцамі мастацкага конкурса сталі Юля Гоўша, Яся Малашчанка і Варвара Галушка.

Прысутныя паглядзелі святочны канцэрт, што далі ўдзельнікі імпрэзы. Усе з цікавасцю слухалі спевы пад гітару Галіны Ярашэвіч і Міхася Бараніка, саксафаніста і скрыпача Андрэя і Паўла Чарнавусаў. З вялікай асалодаю госці і ўдзельнікі „Баранавіцкай вышыванкі 2015” таксама пакаштавалі аладкі і варэнікі, якія ўдала прыгатаваў Мікалай Чарнавус-старэйшы.

Віктар Сырыца, ■



Радкі з лістоў, адгалоскі

Nie zapomnimy!

W informacji „Panichida za ofiary zbrodni” w „Czasopisie” Nr 3/2015 podano, że 1 lutego 2015 r. w cerkwi Świętego Ducha w Białymstoku po raz pierwszy w tym mieście odprawiono nabożeństwo żałobne za ofiary zbrodni ludobójstwa popełnionych przez polskie podziemie po drugiej wojnie światowej na białoruskiej prawosławnej ludności Białostocczyzny. Przypomniałem sobie, że w latach osiemdziesiątych odbyła się panichida, w której uczestniczyłem, za 28 wozaków (furmanów) zamordowanych w lesie koło m. Klichy, gmina Brańsk, w styczniu w 1946 roku. Nabożeństwo odbyło się po niedzielnej liturgii w soborze św. Mikołaja przy ul. Lipowej w Białymstoku. Był to styczeń lub luty. W siedzibie Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego (ZG BTSK) na ul. Warszawskiej 11 w Białymstoku odbywało się posiedzenie zarządu organizacji. W obradach była ogłoszona przerwa i uczestnicy posiedzenia udali się na panichidę. Pamiętam, że z Warszawy byli tam obecni prof. Aleksander Barszczewski (Barski), Fiedar Halonka (jego 16-letni brat był ofiarą ludobójstwa), Wiktar Szwied. Byli też inni członkowie ZG BTSK. W soborze po liturgii pozostała spora ilość białostoczan, gdyż przy całowaniu krzyża duchowny poinformował, że odbędzie się panichida w intencji zamordowanych wozaków.

Fiedar Halonka często opowiadał o tej zbrodni. Pierwszy raz usłyszałem o niej właśnie od niego jeszcze na początku lat siedemdziesiątych. Mówił, że to on miał jechać, w ramach tzw. szarwarku (przymusowego świadczenia pracy), jakoby po drewno na opał do szkół, kiedy sołtys wsi Pasieczniki Wialikije, gdzie mieszkał Fiedar Halonka, wyznaczył furmanów na ten wyjazd na polecenie władz powiatowych Bielska Podlaskiego. Fiedar Halonka nie pojechał, ponieważ zachorował. Pojechał jego brat Aleksy. Został zamordowany razem z innymi wozakami. Jego imię i nazwisko jest na tablicy umieszczonej na pomniku-kurhanie poświęconym ofiarom zbrodni, znajdującym się na cmentarzu wojskowym w Bielsku Podlaskim.

Sołtysi w innych wsiach też wykonywali to polecenie władz powiatu bielskiego wyznaczenia furmanów na szarwark. Przypuszcza się, że ówczesne władze powiatu bielskiego były w zmowie ze zbrodniarzami – ludobójcami (patrz artykuł Heleny Kowalik w tygodniku „Przegląd” z 30.03.2013 r. „Ostatni wyjazd furmanów”; można go przeczytać na stronie internetowej: http://www.tygodnikprzeglad.pl/ostatni-wyjazd-furmanow).


My, Białorusini nie powinniśmy zapominać o ofiarach zbrodni popełnionych na naszym narodzie. Jedną z form pamięci jest organizowanie i udział w nabożeństwach żałobnych-panichidach, odprawianych w intencji tych ofiar. Należy też czasem zapalić znicz, położyć biało-czerwono-białe kwaty na ich grobach.

Oni zginęli, abyśmy my mogli żyć.

***Hieorhi Ziuzia** z Rudni, Warszawa* ■



Narew od wieków jest rzeką, która łączyła różne narody, regiony i kultury . Biorąc początek w ostępach Puszczy Białowieskiej na terenie dzisiejszej Białorusi toczy swój bieg przez podlaską „Krainę Otwartych Okiennic”, by wpłynąć na przestronną, równinną ziemię mazowiecką. Od prawieków zasiedlana przez ludzi bogata jest w pamiątki przeszłości, począwszy od starożytnych grodzisk i kurhanów, przez drewniane wioseczki prawosławnych chłopów, szlacheckie dworki...




Газета „Наша справа”, сапраўды, была дэмакратычнай і смелай. Яна актыўна публікавала розныя звароты, заклікі, пісала пра дзейнасць Грамады ў Заходняй Беларусі, пра розныя напады і арышты сяброў Грамады. Газета на сваіх старонках давала слова ўсім беларусам, якія шчыра распавядалі пра тое, што адбываецца ў іх вёсцы, мястэчку ці ў горадзе. Адукаваныя вяскоўцы і гараджане маглі выказаць свае аб’ектыўныя... (dalej w kolejnych numerach

Czasopis

Nr indeksu 355038, ISSN 1230-1876.
Wydawca: Stowarzyszenie Dziennikarzy Białoruskich.
Adres redakcji:
Białystok, ul. Lipowa 4/221.
Adres do korespondencji:
„Czasopis”, 15-001 Białystok, skr. p. 262. **E-mail**: redakcja@czasopis.pl
http://czasopis.pl
Tel. (85) 653 79 66

Redaktor naczelny: Jerzy Chmielewski, tel. 502 661 316.
Zespół redakcyjny: Wiesław Choruży, Helena Kozłowska-Głogowska, Sławomir Iwaniuk, Tomasz Sulima, Jerzy Sulżyk.
Stali współpracownicy: Piotr Bajko (Białowieża), Joanna Czaban (Krynki), Siarhiej Czyhryn (Słonim), Tamara Bołdak-Janowska (Olsztyn),



Agnieszka Goral (Lublin), Mirosława Łuksza, Janusz Korbel (Białowieża), Jan Maksymiuk (Praga), Mateusz Styrczula, Dorota Wysocka, Ewa Zwierzyńska.
Druk: ZP Ares, Białystok.

Prenumerata: Odpowiednio do liczby zamawianych egzemplarzy i okresu prenumeraty należy wpłacić wielokrotność 4 zł na rachunek: Stowarzyszenie Dziennikarzy Białoruskich: Bank PEKAO S.A. Białystok 30 1240 5211 1111 0000 4928 9343.
Беларускі грамадска-культурны часопіс, прысвечаны пытанням сучаснасці, гісторыі, літаратуры і мастацтва, месца чалавека ў свеце. Форум думкі беларусаў і ўсіх тых, каму блізкая беларуская тэматыка. Пазіцыі аўтараў тэкстаў не заўсёды адпавядаюць пазіцыям рэдакцыі. Не публікуюцца матэрыялы, якія прапагандуюць камуна-фашызм, расізм, нацыянальную варожасць.
Artykuły i listy publikowane są – o ile autor nie życzy sobie inaczej – w języku oryginału: po polsku lub białorusku. Redakcja zastrzega sobie prawo do skrótów, zmian tytułów i redagowania nadesłanych tekstów.
Materiałów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Administracji i Cyfryzacji.
Numer złożono 24 czerwca 2015.